Юбілей „Арэшкаў” ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 52 (2694) Год LII | Беласток, 30 снежня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

www.kamunikat.org

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка KAMUNIKAT.org — адзін з цікавейшых беларускіх, а заадно віртуальных праектаў. Зараз на сайце больш за тысячу кніг і часопісаў. Цалкам нядаўна сайт памяняў свой воблік. Гэта перш за ўсё дзякуючы першай, так значнай падтрымцы — праект атрымаў дафінансаванне польскага Міністэрства замежных спраў у рамках праекта „Польская дапамога 2007”. Гэта напэўна крок уперад. Пры гэтай нагодзе размаўляем са стваральнікам інтэрнэт-бібліятэкі Яраславам ІВАНЮКОМ.

фота архіў „Нівы”

— Пачатак гэта бюлетэнь Радыё Палёнія. Як дайшло да пераўтварэння бюлетэня ў бібліятэку?

— Працуючы ў Беларускай рэдакцыі Радыё Палёнія я сапраўды займаўся падрыхтоўкай бюлетэня для слухачоў, які называўся „Камунікат”. У бюлетэні, у папяровым выглядзе, друкаваліся матэрыялы, якія раней прагучалі ў эфіры. На старонках папяровага бюлетэня з'явіўся таксама мой аўтарскі цыкл „Гістарычнае падарожжа”. Тады яшчэ Інтэрнэт не быў так папулярны, але ўжо адчувалася, што гэты медыум будзе развівацца. Па ўласнай ініцыятыве, ужо працуючы на Радыё Беласток, вырашыў я ўсе матэрыялы перанесці з паперы ў Інтэрнэт. Падрыхтаваў я (не без значнай дапамогі маёй жонкі Дарыі) невялічкі сайт і... так усё пачалося. Аказалася, што шмат наведвальнікаў заходзіць на наш сайт менавіта дзеля гістарычных тэм. Інтэрнаўты пачалі пісаць, што ўсё ж такі гэтых матэрыялаў не хапае. Лагічным было тады звярнуцца да Беларускага гістарычнага таварыства, да яго старшыні д-ра Алега Латышонка ды рэдактара „Białoruskich Zeszytów Historycznych — Беларускага гістарычнага зборніка” праф. Яўгена Мірановіча з пытаннем пра магчымасць змяшчання паасобных артыкулаў і выдаваных Таварыствам кніг на сайце. Дазвол я атрымаў і з-за гэтага адразу павялічылася колькасць неведвальнікаў. Было зразумела, што я патрапіў у своеасаблівы вакуум. Пачаў тады звяртацца да іншых выдаўцоў беларускай літаратуры і прасіць згоды на чарговыя публікацыі ў Інтэрнэце. Звычайна яны пагаджаліся. Як адны з першых на сайт патрапілі кніжкі выдаваныя Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва”. Усё не было б так проста без выдатнай дапамогі Аляксандра Максімюка, які шмат кніжак вярстаў і стварыў дасканала ўпарадкаваны архіў. Пасля згоды выдавецтва Алік перадаваў мне электронны варыянт кнігі, што мне вельмі дапамагала. А як гэта пераўтварылася ў сапраўдную бібліятэку? Сам не ведаю. Хіба, дзякуючы пастаяннай працы над яе стваранням.

— Што паказваюць статыстыкі наведванняў?

— Зараз сайт KAMUNIKAT.org, які абнавіўся ў верасні 2007 года, адкрываецца васемсот-тысячу разоў удзень. У дзень прэм'еры новага Камунікату ў Інтэрнэце, напрыканцы верасня, сайт наведала больш за 4 000 асоб. У пошуках беларускай літаратуры заходзяць да нас людзі з больш чым ста краін свету. Пераважаюць наведвальнікі з Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны, Расіі ці Злучаных Штатаў Амерыкі, але ў статыстыцы бачны таксама такія краіны як Ізраіль, Індыя ці Кітай. Калі гаварыць пра тое, што найбольш цікавіць наведвальнікаў, то доўгі час у рэйтынгу лідзіраваў польска-беларускі/беларуска-польскі дзіцячы слоўнік. У снежні самай папулярнай з'яўляецца аўдыёкніга Івана Саверчанкі і Зміцера Санько „150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі”. На сайце дарэчы, з двухтыднёвым спазненнем можна таксама чытаць тыднёвік „Ніва”. На топ-спіску пераважаюць гістарычныя выданні.

— Гэта, здаецца, доказ вялікага значэння ідэі Камунікату...

— Дзякуй за прызнанне. Мне здаецца, што паколькі сайт кожны дзень адкрываецца столькі разоў, тады самі інтэрнаўты належным чынам ацанілі гэтую ідэю, але таксама і аўтары, сярод якіх Уладзімір Арлоў, Рыгор Барадулін, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Эдуард Акулін, Адам Глобус ці нашы белавежцы: Надзея Артымовіч, Віктар Швед ці Ян Чыквін. Вялікім гонарам для мяне з'яўляецца таксама доўгае ўжо супрацоўніцтва з выдатным перакладчыкам Васілём Сёмухам, пераклады якога часта найперш з'яўляліся на сайце, а потым выдаваліся друкам.

— Цяперашні Камунікат гэта не толькі кніжкі...

— Так, на сайце Беларускай Інтэрнэт-Бібліятэкі KAMUNIKAT.org знаходзяцца ўжо аўдыёкнігі, а таксама першы відэазапіс. Дзякуючы дазволу Радыё Беласток на сайце ўжо з'явіліся, а з часам будзе намнога больш гутарак з аўтарамі ды выдаўцамі беларускіх кніжак ці часопісаў, якія раней прагучалі ў перадачы „Пад знакам Пагоні”. Проста, кожная бібліятэка ў сваіх фондах мае цяпер мультымедыйныя выданні. Камунікат, які з'яўляецца інтэрнэт-бібліятэкай, тым больш пра гэта павінен думаць. Тут таксама шмат спасылак на сайты-сябры, а ў перспектыве хацелася б, каб на гэтым сайце знайшлася ўся інфармацыя пра розныя беларускія культурніцкія падзеі, якія адбываюцца перш за ўсё ў нас, на Беласточчыне, але таксама і ў Беларусі ці на эміграцыі. Але гэта будучыня, бо зараз не паспяваю з усім справіцца, на ўсё не хапае часу...

— Якія ў Цябе памкненні наконт развіцця сайта?

— Вялікія... *(усмешка)* Не пра ўсё зараз хацелася б гаварыць, але... Перш за ўсё хацелася б зрабіць усё магчымае дзеля папулярызацыі сайта ў беларускім Інтэрнэце, каб усё больш людзей магло карыстацца гэтым зборам. Вядуцца ўжо таксама размовы з новымі аўтарамі. Варта было б таксама прыцягнуць некага да працы над сайтам. Зараз вялікую дапамогу аказвае Аляксандр Максімюк, які наглядае за тэхнічнымі справамі ды Наталля Герасімюк, якая мае вопыт у стварэнні традыцыйнай бібліятэкі. Гэта ж яна сарганізавала бібліятэку ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы. Дарэчы, калі нехта хацеў бы дапамагчы пры сайце, калі ласка, звяртайцеся па э-мейлу kamunikat@kamunikat.org. Але найбольшае маё жаданне — проста зрабіць сайт як найшырэй даступным для наведальнікаў.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

РАЗАМ З „НІВАЙ” — ДОМА, НА ПРАЦЫ, ВА ЎСТАНОВАХ

Вялікая прамоцыя для падпісчыкаў (прэнумератараў) „Нівы”!

Прыватныя асобы, фірмы, самаўрадавыя і дзяржаўныя ўстановы! Калі Вы яшчэ не зрабілі падпіскі на наш тыднёвік на 2008 год, дык спяшайцеся. Калі да канца студзеня Вы на пошце, у кіёсках „Руху” і „Кальпортэра” або ў рэдакцыі падпішацеся на „Ніву” да канца 2008 г. і прынясеце непасрэдна або дашлеце па пошце распіску аб падпісцы да 15 лютага 2008 г. у сакратарыят газеты, Вас чакаюць узнагароды!!!

Кожны адзін падпісчык (прэнумератар) атрымае бясплатна апошнюю, выдадзеную нашай рэдакцыяй кнігу „Час трывогі і надзеі. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў 1944–1956 гадах”. Кніга з'яўляецца запісам успамінаў нашых дзядоў і бацькоў пра іх цяжкі пасляваенны лёс. Шмат увагі і дакументаў адводзіцца спаленым вёскам і загінуўшым там людзям. Кніжка мае перш за ўсё трапіць толькі да падпісчыкаў.

Калі Вы, Ваша фірма ці ўстанова падпішацца на 2 экземпляры „Нівы”, тады апрача кніжкі атрымаеце яшчэ бясплатна кампакт-дыск і касету з цікавай беларускай музыкай калектываў Беласточчыны.

Калі ў Вас будзе жаданне падпісацца на 3 і больш экземпляраў „Нівы” да канца 2008 г., апрача вышэйпералічаных падарункаў Вы атрымаеце падборку ўжо недаступных у распаўсюдзе рэдакцыйных выданняў ды іншыя неспадзяванкі.

МНОГА КОЖНЫ З НАС ГУБЛЯЕ, КАЛІ „НІВЫ” НЕ ЧЫТАЕ.

9 770546 196000

Мёртвая кропка

Вось і яшчэ адзін год прайшоў. Па ўжо ўсталяванай на Беларусі традыцыі людзі 31 снежня вечарам сядуць за стол. Падымуць кілішкі і скажуць: „Няхай усё благое застанецца ў мінулым годзе".

Дык якім жа ён быў для беларусаў той 2007 год? Што ён нам прынёс? Куды ён нас прывёў? Вялікі карабель заўсёды адпраўляецца ў вялікае плаванне. Шчупак лезе ў ваду, лебедзь імкнецца ў нябёсы, а рак паўзе назад. А блыхасты сабака ўвесь час ганяецца за сваім хвастом. І з якой бы ён хуткасцю не насіўся, увесь час круціцца на адным і тым жа месцы.

Гэты год нечым быў на таго сабаку падобны. Так як і мінулы прайшоў ён пад знакам супрацьстаяння ўлады і апазіцыі. І нічога да лепшага не змянілася. Усё засталося на былых пазіцыях.

Уладзе ўдалося прыціснуць апазіцыю яшчэ мацней. Але гэта не вырашыла праблем самой улады. Найперш энерганосьбіты, у недалёкім мінулым — галоўны „гонар" існага рэжыму. Маўляў, курс на інтэграцыю з Расіяй быў абраны правільна і таму рускія нам прадаюць газ і нафту як сабе. Але „старэйшы брат" з тварам Пуціна і накінутай навагодняй маскай Газпрама вырашыў, што братэрства па-беларуску яму мала. Таму працягваў ставіць умовы: або ўваход у Расію часткамі ці цалкам, або рыначныя кошты. Галоўны канёк беларускай улады разваліўся як картачная хатка. І ў год свінні стала даражэць свініна, а разам з ёй і ўсё астатняе. І як вынік, навагоднім падарункам для беларусаў стала так званае ўпарадкаванне льгот.

Улада магла б паспрабаваць патлумачыць людзям, што мае вялікія праблемы з бюджэтам і мусіць разабрацца з тымі льготамі. Рахманыя і цярплівыя беларусы ўсё зразумелі б ды чарговы раз прамаўчалі б. Але ідэолагі ўпарадкавання льгот заявілі нешта іншае. Маўляў, даходы грамадзян выраслі і з тае прычыны трэба паздымаць ільготы тым, хто іх не патрабуе. У катэгорыю „пабагацеўшых" грамадзян увайшлі нават школьнікі, якія, каб даехаць да месца вучобы, мусяць зараз купляць талоны на гарадскі транспарт па тых жа коштах, што і іх бацькі.

Затое мы пачынаем узброівацца аж да зубоў. На Беларусь вернуцца ракеты сярэдняй далечыні палёту расійскай вытворчасці. Гэта „наш" адказ усталёўванаму амерыканцамі супрацьракетнаму шчыту ў Польшчы і Чэхіі.

Чаму амерыканскі шчыт тычыцца нас улада не тлумачыць. Гэтак жа як і не можа даходліва давесці, чаму прыватных прадпрымальнікаў больш не павінна быць. Да Новага года яны мусяць ператварыцца ва унітарныя прадпрыемствы. Прадпрымальнікі паспрабавалі пратэставаць і адразу даведаліся, што гэта такое, калі становішся апазіцыяй. Іншыя колы насельніцтва пратэстуюць на кухні. Кажуць, што грошай з тых павялічаных даходаў чамусьці няма. Але галоўны страх — згубіць працу. На працу будуць хадзіць, нават калі за гэта трэба будзе даплачваць. Бо так трэба. Так было заўсёды. Галоўнае, каб стаж не перарываўся. Таму мусіш цярпець, бо ўсё адно нічога не зменіш.

Тыя, хто мяркуе, што сітуацыю цалкам рэальна можна змяніць, зрушыць з мёртвай кропкі і вельмі трэба гэта зрабіць (маецца на ўвазе палітычная апазіцыя), таксама, як і ўлада, круціліся на месцы, ганяючыся за хвастом. Былы адзіны кандыдат ад апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах на думку большасці палітычных партый больш стаў непатрэбны. А той не пагадзіўся ды стаў рабіць сваю апазіцыю. І да ўлады, і да апазіцыі. Апазіцыя стала шукаць чарговага „адзінага" ды не знайшла. Вырашыла, што ў аб'яднанай кааліцыі будуць кіраваць па чарзе лідэры палітычных партый. І галоўным супрацьстаяннем пасля выбараў стала супрацьстаянне паміж самімі сабой, што і паказалі выбары ў самай моцнай палітычнай партыі БНФ. З двух галоўных прэтэндэнтаў на пасаду кіраўніка перамог трэці. А ўся апазіцыя, ці нават дзве, рыхтуюцца да чарговых парламенцкіх выбараў, хоць сцвярджаюць, што аніводзін з кандыдатаў ад дэмакратаў дэпутатам так і не стане. Пагоня за сваім хвастом увесь час працягваецца, хуткасць імкліва павялічваецца, але з месца зрушыцца не ўдаецца.

Год свінні паступова саступае пазіцыі году пацука. Застаецца толькі спадзявацца, што пацук — істота разумная і за хвастом лётаць не стане. І вельмі хочацца пажадаць у наступным годзе ўсім нам, ды і ўладзе, многа розуму. А нам яшчэ і крыху ўдачы. І каб мёртвая кропка, дзе мы тузаемся, стала стартам для скачка наперад.

Віктар САЗОНАЎ

Цана спакою

Калі пішу гэтыя словы, за акном увогуле не адчуваецца каляднага настрою. Надвор'е быццам застыла і заснула, як пры першых лістападаўскіх непагадзях. Без сонца, снегу, марозу і нармальнасці пачынаем хварэць чарговымі дэпрэсіямі і алкагольнымі запоямі. Большасць з нас апынулася на раздарожжы. У віры скарацечнага жыцця маё пакаленне штораз часцей трапляе на могілкі, у псіхіятрычныя бальніцы, атрымоўваючы па дарозе ў зарплату кровазліццё мозгу ці сардэчныя прыступы. Такая цана ўваходу ў дарослае жыццё ў час гэтак званай трансфармацыі. Будучы ў душэўным разладзе паміж старымі каштоўнасцямі і новымі выпрабаваннямі ды патрабаваннямі, у сваіх асабістых ці нацыянальна-грамадскіх памкненнях апынуліся яны ў пераважнай большасці ў тупіку. Адзінае лякарства — гэта, захоўваючы спакой у дзеяннях, не забываць пра мары маладосці.

Цяпер для большасці грамадства напляваць на тое, што ў снежні цана яблык, памідораў, агуркоў, апельсінаў, грэйпфрутаў больш-менш такая самая. І кожны можа купіць іх колькі заўгодна. Аднак нішто нікога не цешыць. Не здзівяць ужо бацькі ці хросныя сваіх малышоў аніякімі цацкамі, тым больш ласункамі. Пяць хвілін задавальнення падарункамі і ўсё ўжо непатрэбнае, нямоднае. Цяжка мне ўявіць зараз дзіця, якое на працягу года часу не запатрабавала б ад бацькоў новай цацкі. Наш канзумерызм здаецца проста бязмежным. Спасцігнула нас хвароба шаленства чалавечых мазгоў. Найлепей усім падабаюцца толькі мелодыі калядак як прыбаўка да рэкламных ролікаў у тэлебачанні і гіпермаркетах. І патрата грошай на непатрэбшчыну. Дзесяць кілаграмаў кілбас у прамоцыі, якіх не захочуць з'есці ні галодны сабака, ні кот, хутка знаходзіць месца ў нашых сумках, каб потым вокамгненна трапіць на агульную сметніцу. Таксама як нейкая рэкламаваная гадасць для прыняцця ванны ў дзесяцілітровай каністры толькі за... пяць злотых, пасля якой трэба бегчы да дэрматолага ратаваць скуру і валасы. І як кадзіраваныя зомбі больш-менш штотыдзень спраўляем такі ж пакупніцкі рытуал.

Хутчэй, вышэй, мацней — заклікалі старажытныя дасягаць пэўныя мэты; больш, хутчэй і сыцей — напрашваюцца сённяшнія ахвяры. Калі не апамятаемся, то хутка накормленая пад завязку Еўропа можа патрапіць не толькі на звалку, але і ў канаву гісторыі.

Зараз і на нашых вёсках ды мястэчках можна наглядаць цікавую з'яву. У большасці дамы, клуні, хлявы, свірны замянілі свае функцыі: з жыллёвых і пабытовых сталі складамі непатрэбных рэчаў гарадскіх дзяцей і ўнукаў. Наступіла эпоха поўнай постіндустрыялізацыі вёскі самой па сабе. Такім чынам наступіў канчатковы зыход нашай меншасці як сялянскай нацыі. Памятаю доўгія спрэчкі за святочнымі сталамі пакалення маіх бацькоў, якое, не бачучы ў родных дзецях пераемнікаў сваіх малых гаспадарак, за кожным разам задумвалася: а хто ж пракорміць тады тую ж вялікую Польшчу, калі ўсе будуць у гарадах? Аказваецца, накармілі, а яны самі перайшлі на паёк аб'язных крамаў і дамоў для састарэлых. Сумная праўда, але такое ў нас здарылася. Аднак гэта нераўназначнае са знікненнем нас як беларускай меншасці. Паўтараючы за класікамі: у прыродзе нічога не прападае, толькі змяняе ўласніка або форму. Зямлю мы аддалі. Набылі яе іншыя, пакідаючы нам, аўтахтонам, права на сваю зямлю ў выглядзе ўчастка на прыхадскіх могілках. А форма, у якой хочам застацца беларусамі, залежыць ад мазгоў і ўкладзенай працы. Трэба ўмела карыстацца законамі, якія прадугледжвае польскае і еўрапейскае заканадаўства. У адваротным выпадку сапраўды можам застацца ў дурнях, калі адзіным эфектам нашага знаходжання ў бязмежнай шэнгенскай Еўропе будзе добраахвотная эміграцыя... без зваротнай дарогі. Адрачэмся тады бацькаўшчыны, блізкіх, сябе.

Калі пісаліся гэтыя словы, я не быў у дэпрэсіі. Проста лічу сваім, як рэдактара, абавязкам зрабіць усё, каб „Ніва" была газетай, у якой шчыра пішам ад сябе і пра сябе. Зразумела, можам памыляцца, але заўсёды хочам быць разам са сваімі чытачамі. Таксама і ў 2008 годзе.

Яўген ВАПА

Вачыма еўрапейца

Па натуральных патрэбах

Штосьці мне перад гэтым Новым годам нешта не атрымліваецца. Хацеў я, напрыклад, яшчэ ў 2007 годзе паразмаўляць для Вас з новым старшынёй дэлегацыі Еўрапарламента па справах Беларусі Яцкам Пратасевічам, але не змог. Ды па чарзе.

У адной з агульнапольскіх газет у апошніх днях лістапада я прачытаў, што еўрадэпутат ад Грамадзянскай платформы Яцак Пратасевіч з Вроцлава заменіць шэфа згаданай еўрапарламенцкай групы Багдана Кліха, якога прэм'ер Дональд Туск назначыў шэфам ведамства нацыянальнай абароны. Дагэтуль з панам Кліхам даводзілася мне размаўляць без праблем, незалежна ад таго, ці быў ён у той час у Бруселі, Страсбургу ці родным Кракаве. Аказалася, што з еўрадэпутатам Яцкам Пратасевічам звязацца цяжэй, хоць я спадзяваўся, што кантакт мой, і „Нівы", і Вас усіх з ім будзе такім жа беспраблемным. Званю я вось у офіс пана Пратасевіча ў Вроцлаве з просьбай дапамагчы скантактавацца з ім. Працаўніца адказвае:

— Так, так, я перадам, што вы званілі.

Мінае пару дзён і нічагуткі — ні слыху, ні дыху. Таму зноў званю ў Вроцлаў.

— Ой, яшчэ вам ніхто не пазваніў?!

Праз пару чарговых дзён тая ж самая пані зараз пасля восьмай раніцы звоніць мне:

— Яшчэ сёння асістэнт пана дэпутата вам адзвоніць.

Назаўтра тэлефануе мне асістэнт:

— Праз хвіліну я пераключу (? — М. Х.) размову з панам дэпутатам.

Ну і фактычна асістэнт дэпутата Пратасевіча пераключыў. Яцак Пратасевіч, аднак, прызнаўся:

— Гэта нейкае інфармацыйнае замяшанне. У мяне няма яшчэ назначэння. Прашу кантактавацца са мною 13 снежня. Тады я маю яго атрымаць.

Ад 13 снежня мая спроба скантактавацца з панам дэпутатам, а нават з яго асістэнтам, не ўдалася. Спробы размовы з ім абмежаваліся да чарговага міласлоўя з боку працаўніцы вроцлаўскага офіса. Затое на сайце еўрадэпутата, будучага (хіба?) старшыні групы па справах Беларусі я прачытаў: „Я быў ушанаваны прапановай заняць чыноўніцкую пасаду ў кабінеце Дональда Туска. Аднак прапанова кіраваць Установай камітэта еўрапейскай інтэграцыі была пададзена зараз пасля таго, калі ў Еўрапарламенце пачалася працэдура майго вылучэння на пост старшыні дэлегацыі ЕП па справах Беларусі. Згаданая краіна гэта, бадай, апошні аўтарытарны рэжым у Еўропе і ў мяне з'явілася натуральная патрэба, каб гэтае становішча змяніць. Таму я рашыўся застацца ў Еўрапарламенце і ахвяраваць найбліжэйшыя гады на дапамогу беларускім дэмакратычным асяроддзям ды Землякам там пражываючым".

І тут я буду кплівы, паколькі не было ў мяне шанцу распытацца аб гэтым у самога дэпутата. Думаю, што Беларусь гэта не рэжым, аб чым пан дэпутат павінен ведаць, хоць бы як польскі філолаг па адукацыі і аўтар магістэрскай працы аб вроцлаўскім прэсавым рынку. Рэжым гэта ўлада, а не дзяржава з яе народам, грамадствам. Не разумею таксама, што мела б значыць сцвярджэнне: „З'явілася ў мяне натуральная патрэба, каб змяніць гэтае становішча". Ну бо што гэта такое, ці не спроба дзяржаўнага перавароту ў гэтак званым *kraju ościennym*? Пасля тае заявы пана еўрадэпутата хочацца мне — у чаканні „пераключэння" маіх ужо падрыхтаваных пытанняў — дайсці яшчэ глыбей да інфармацыі пра ягоную дзейнасць. Таму клікнуў я на ягоным сайце на іконку „Справаздача з дэпутацкай дзейнасці ў ЕП". І тут сюрпрыз — кампʼютэр мне адказаў: „Немагчыма знайсці такі файл".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. Пісаў я гэты тэкст 18 снежня.

„Арэшкі” — разам ужо 35 гадоў

Аляксей МАРОЗ

Фальклорны калектыў „Арэшкі” з Арэшкава, заснаваны ў 1972 годзе, дастойна правёў 35 гадоў, выступаючы з мясцовымі песнямі на шматлікіх конкурсах, беларускіх фэстах і іншых мерапрыемствах у Польшчы і за мяжой. Ініцыятарам стварэння калектыву быў вясковы гурток Беларускага грамадска-культурнага таварыства і яго старшыня Ніна Авярчук, якая пасля многа гадоў была яго кіраўніком. Спачатку побач вакальнага калектыву ў Арэшкаве стаў дзейнічаць вясковы драмгурток, якім кіраваў Ян Крупа. З часам абодва калектывы аб'ядналіся і амалоджаны фальклорны калектыў узмоцніў сваю актыўнасць. Па сённяшні дзень „Арэшкі” захапляюць публіку моцнымі галасамі і непаўторным спевам. Часта перамагаюць на цэнтральным аглядзе Фестывалю „Беларуская песня” і іншых конкурсных мерапрыемствах, да якіх рыхтуюцца з асаблівай стараннасцю. Расспяваныя жанчыны ўдала падтрымліваюць традыцыю Арэшкава, жыхары якога ў мінулым часта і ахвотна спявалі пры розных нагодах, а развучаныя песні перадавалі з пакалення ў пакаленне. Вельмі добра, што ўдалося запісаць і выдаць словы і ноты больш за сто пяцідзесяці народных песень з рэпертуару арэшкаўскага калектыву, якія з'яўляюцца іх творчым плёнам.

Амбасадары традыцыйнага фальклору

— „Арэшкі” гэта самы лепшы калектыў Беласточчыны, які спявае аўтэнтычныя фальклорныя песні. Жанчыны з Арэшкава выступаюць акапэла (без акампанементу), што дазваляе добра ўслухацца ў моц і прыгажосць іх галасоў, якія ствараюць адзін арганізм, — захапляецца юбілярамі Сцяпан Копа — галоўны музычны інструктар па справах фальклору пагранічча Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку.

— Арэшкаўскія жанчыны з'яўляюцца амбасадарамі традыцыйнага фальклору Падляшша і трэба іх на руках насіць за багацце песень, якія яны захавалі ад забыцця і прэзентуюць на сцэне. На вялікую ўвагу заслугоўвае іх непаўторная, поўная гармоніі манера спеву. Калі б разбудзілі мяне ноччу, я патрапіў бы вылучыць сярод многіх выканаўцаў „Арэшкі”, якіх спеў адначасна характэрны для прыпушчанскага рэгіёна Гайнаўшчыны ці нават Бельшчыны і захоўвае многа супольнага з замежнымі калектывамі з Камянца або Жабінкі. Ад арэшкаўскага калектыву можам многа навучыцца традыцыйнаму фальклорнаму спеву. Гэтыя жанчыны без прафесійнай адукацыі навучыліся вельмі ўмела карыстацца сваімі цудоўнымі галасамі і могуць доўга спяваць без адпачынку. Ад „Арэшкаў” вучылася спяваць таксама і наша „Жэмэрва”, — пералічвае козыры арэшкаўскага калектыву Дарафей Фіёнік, старшыня Аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах”.

Увесь час на высокім узроўні

— Увесь час калектыў трымае вельмі высокі ўзровень спеву і няма ў яго настройнасці. Найчасцей „Арэшкі” выконваюць песні на два галасы, але непаўторны трэці голас Таццяны Гурын вельмі ўпрыгожвае выступленні, — гаворыць Сцяпан Копа.

Таццяна Гурын (выводзіцца з музычна здольнай сям'і з Істока) спявае ў арэшкаўскім калектыве ад самога пачатку, але апошнім часам выступае радзей.

— Наш спеў заўважылі ў час выступлення на вясковых дажынках і падказалі нам заснаваць свой фальклорны калектыў. Адбор рабіў у нас Аляксандр Лукашук і ён вучыў нас правільнаму спяванню, а пасля дапамагаў нам Сцяпан Копа (быў інструктарам з 1987 года, але яшчэ і зараз гатовы дапамагаць нам парадамі). Спачатку выступала ў нас нямнога асоб, а пасля далучыліся малодшыя жанчыны, — заяўляе Таццяна Гурын. — Я так люблю песні, што мне лепш было б не пад'есці, але паспяваць. Мой муж спачатку злаваўся, што выязджаю з калектывам, але пасля змірыўся.

Члены калектыву „Арэшкі” кажуць, што ў іх вёсцы было многа жанчын, якія хацелі спяваць, але пасля праверкі галасоў і музычных здольнасцей выбраны былі асобы з найлепшымі галасамі.

— Спачатку нас было многа ў вакальным і драматычным калектывах. Мы, малодшыя жанчыны, запісаліся ў драмгурток, які вёў Ян Крупа, вядомы нам з „Лявоніхі”. Старэйшыя жанчыны ўступілі ў вакальны калектыў, якім стаў кіраваць Аляксандр Лукашук з Гайнаўкі. Запамяталіся нам адны з першых восеньскіх сустрэч, на якія мы прыходзілі цяплей апранутыя. Ян Крупа дапамагаў нам рыхтаваць цікавыя сцэнкі, з якімі мы выступалі ў Гайнаўцы, Бельску-Падляшскім, Беластоку і многіх іншых мясцовасцях, — пачынае расказ Надзея Андрасюк, якая выступала ў драмгуртку, а пасля перайшла ў вакальны калектыў. — Да драматычнага гуртка належалі таксама жанчыны з вакальнага калектыву. У нашым рэпертуары былі сцэнкі „Пакудзелле”, „Нядзеля на вёсцы”, „Каравай”, „Вяселле” і многія іншыя. Заўсёды мы выступалі на сваім арэшкаўскім дыялекце.

У 1976 годзе да вакальнага калектыву далучылі пяць сённяшніх яго членаў і разам у ім сталі спяваць ажно 22 асобы.

— Мы разам дзейнічалі ў гуртках вясковых гаспадынь і БГКТ ды ўсёй кампаніяй запісаліся ў драмгурток, а пасля разам уступілі ў вакальны калектыў, — кажа Марыя Скепка, якая спявае ўвесь час разам з сястрой Надзеяй Грош.

— Калі менш асоб стала належаць да драмгуртка, ён спыніў сваю дзейнасць. Калі мы (5 жанчын — А. М.) далучыліся да фальклорнага калектыву, выступалі разам са старэйшымі ад нас жанчынамі, а нашым кіраўніком надалей была Ніна Авярчук, — інфармуе сённяшняя кіраўнік „Арэшкаў” Надзея Грушэўская. — Пазней старэйшыя жанчыны па сямейных прычынах і з-за горшага здароўя сталі адыходзіць ад нашага калектыву і на многія гады замацаваўся склад з дзевяці асаб.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

З „Арэшкаў” адышлі яшчэ дзве Ніны Авярчук і Вольга Раманюк, а па сённяшні дзень фальклор роднай вёскі расслаўляюць Надзея Грушэўская, Надзея Андрасюк, Надзея Грош, Марыя Скепка, Таццяна Гурын і трэцяя Ніна Авярчук.

Выступалі не толькі перад беларускай публікай

Цяжка было б злічыць колькасць канцэртаў „Арэшкаў” перад беларускай публікай Беласточчыны, у час конкурсных аглядаў, беларускіх фэстаў і іншых мерапрыемстваў. Мае субяседніцы пералічваюць таксама мясцовасці, у якіх выступалі перад польскай публікай: Варшава, Сувалкі, Пуньск, Сопат, Драгічын, Чорная-Беластоцкая, Чараўкі і іншыя. Арэшкаўскі калектыў тройчы выязджаў у Беларусь. Два разы выступаў у Гродне і адзін раз у Мінску. Спяваў таксама ў Луцку на Украіне.

— У Беларусь запрашалі нас больш разоў, але нашы замежныя выезды даўжэйшыя ад падарожжа па Польшчы. Трэба было займацца каровамі і сваімі гаспадаркамі і мы адмоўна адказвалі на чарговыя запрашэнні, — гаворыць Надзея Андрасюк. — Калі б нехта згадзіўся даіць нашых кароў, мы можа і часцей адпраўляліся б у замежныя гастролі.

„Арэшкі” найчасцей выступалі на Фестывалі „Беларуская песня”, а пасля сталі часта спяваць на аглядах калядак, прэзентавалі велікапосныя творы і выконвалі хаўтурныя песні.

— Найчасцей мы вярталіся з цэнтральнага конкурсу „Беларускай песні” з прызамі — першым або другім месцам, але здаралася, што займалі трэцяе месца. Перамагалі таксама на аглядах калядак, — успамінае кіраўнік калектыву Надзея Грушэўская.

„Арэшкі” выступалі з агулькамі, жніўнымі песнямі, вясельнымі і хрысціннымі творамі, выконвалі калыханкі, забаўлянкі, калядкі і многа іншых народных твораў, запісаных у сваім сяле і навакольных вёсках.

— На беларускім фестывалі мы заўсёды выступалі з даўнімі песнямі. Развучвалі мы іх ад старэйшых аднавяскоўцаў, а таксама ад людзей з суседніх сёл. Адны асобы звяртаюць нам увагу, што мы спяваем плаксівыя песні, а другія, што кранаючыя сэрца, а мы проста выконваем творы, якія ўзніклі ў мінулым, калі на вёсцы жылося цяжка і многа людзей гаравала, — кажа Надзея Андрасюк. — Мы спяваем па-свойму, так, як гаворым і кажуць нам, каб так рабіць надалей.

Хочацца надалей спяваць

Ужо як вакальны калектыў „Арэшкі” выступалі таксама з абрадавымі сцэнкамі, напрыклад, з „Вячоркамі”, „Агулькамі”, „Перапяліцай”.

— Мы моцна звыкліся з калектывам, які ў нашае штодзённае жыццё ўносіць радасныя хвіліны. Ужо зараз мы і слабейшыя, але як пачуем музыку, то нас цягне да спеву, — кажа Марыя Скепка.

— Калі мы сыходзім са сцэны, нас віншуюць і распытваюць, дзе можна купіць нашу касету, тады дабаўляюцца нам сілы і хочацца надалей спяваць, — заяўляе Надзея Андрасюк.

Гайнаўскі дом культуры ў дзевяностых гадах выдаў касету з творамі ў выкананні „Арэшкаў”, але хіба ўжо няма яе ў продажы. Можа варта было б узнавіць выданне, з аўтарскімі правамі, або выдаць кампакт-дыск, на які раней не рашыліся арэшкаўскія жанчыны. Звыш 150 песень, якія запісаў Сцяпан Копа, выдадзены былі Ваяводскім асяродкам анімацыі культуры з фінансавай успамогай Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

— Гэты спеўнік з'яўляецца рэзультатам шматгадовага збірання і запісвання песень, якія выконваў калектыў „Арэшкі”, — кажа Сцяпан Копа, які таксама вельмі многа дапамагаў калектыву, будучы шматгадовым яго інструктарам.

Жанчыны з Арэшкава ўспамінаюць свае выступленні ў чатырох народных строях.

— Тры ўборы хіба купляліся ў галоўным за сродкі нашага гміннага бюджэту. Наша войт Вольга Рыгаровіч клапоціцца, каб мы мелі транспарт, калі выязджаем на канцэрты, — гаворыць Надзея Андрасюк. — Куплю апошніх строяў у галоўным прафінансавала нам БГКТ.

На працягу 35 гадоў арэшкаўскі калектыў атрымаў шмат узнагарод, але самай высокай лічаць тую, што атрымалі ад міністра культуры Польшчы.

— Мы нецярпліва чакаем рэпетыцый, каб спаткацца і супольна паспяваць, а пасля з'яўляецца яшчэ магчымасць пагаварыць пра штодзённыя справы, — гаворыць Надзея Андрасюк. — У час супольных сустрэч і выездаў маем нагоду забыць пра сямейныя праблемы.

— Галоўнае, каб падтрымаць традыцыю арэшкаўскага спявання і захаваць старыя песні для наступных пакаленняў. Шкада, што малодшыя не горнуцца ў калектыў, але калі будзе ў нас здароўе, будзем яшчэ спяваць, — гаворыць на развітанне кіраўнік Надзея Грушэўская, паколькі калектыў апошнім часам менш выступаў. — Зараз мы рыхтуемся да беларускага фестывалю і да калядных аглядаў.

Указальнікі на роднай мове

З вялікай увагай глядзеў я беларускую тэлеперадачу ў нядзелю 25 лістапада, якую вёў Мікола Ваўранюк. Было ў ёй паказана, як нашы журналісты М. Ваўранюк і Міхал Андрасюк пабывалі ў мясцовасцях, дзе пражываюць нямецкая і літоўская нацыянальныя меншасці. Як прыемна было паглядзець, што там, дзе жывуць немцы, указальнікі і названні мясцовасцей двухмоўныя — на дзяржаўнай і нямецкай мовах, а там, дзе літоўцы — таксама на польскай і літоўскай мовах.

Тут прыйшла мне на думку наша Усходняя сцяна, дзе шмат пражывае беларусаў, асабліва ў нашым Гайнаўскім павеце. Гарадская ўправа Гайнаўкі прыняла пастанову аб увядзенні беларускай мовы як дапаможнай у працы гарадской адміністрацыі. Але гэтага няма ў Нарваўскай ды суседніх з ёю гмінах, дзе пражывае больш за 20% беларусаў і войтамі ў іх з'яўляюцца беларусы па нацыянальнасці. Гэта гміна Нарва, войтам якой Якуб Садоўскі, гміна Чыжы з войтам Юрыем Васілюком, гміна Нараўка, войтам якой з'яўляецца Мікалай Павільч ды гміна Гайнаўка, якую прадстаўляе войт Вольга Рыгаровіч.

Вядома, шкада, што няма ўвядзення законам беларускай мовы. Хоць я, калі афармляю нейкія справы ў сваёй гміне, дык заўсёды размаўляю на тутэйшай гаворцы. Мяне ўсе тут разумеюць і да мяне таксама звяртаюцца па-свойму. Ніхто мне яшчэ не сказаў, каб я гаварыў папольску.

У згаданых гмінах няма таксама двухмоўных указальнікаў на польскай і беларускай мовах. А на гэта грошы ёсць у Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі, трэба толькі туды паслаць адпаведнае прашэнне, а грошы атрымаюць.

Падумайце, даражэнькія войты, і не забывайце свайго паходжання, і роднай беларускай мовы, беражыце яе і распаўсюджвайце, каб яна квітнела ў нашым асяроддзі.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Беларусь перамагае

Дзеці з Беларусі паспяхова выступаюць у песенных конкурсах Еўрабачання. Вечарам 8 снежня адбыўся ў Ратэрдаме (Нідэрланды) пяты конкурс дзіцячай песні.

Пераможцам конкурсу аказаўся беларускі дзесяцігадовы школьнік Аляксей Жыгалковіч. Спяваў ён дасканала разам з танцавальным гуртом песеньку „С друзьями нам по пути".

Тэлегледачы 17-ці еўрапейскіх краін прагаласавалі за Беларусь. Адным пунктам Алёша апярэдзіў дзіцячы ансамбль з Арменіі. У ліку пераможцаў апынуліся таксама юныя выканаўцы з Сербіі і Македоніі.

Варта адзначыць, што ў пазапрошлым годзе гэты конкурс выйграла школьніца з Беларусі, а год назад беларускі хлопчык быў другім. Дзіцячы канцэрт Еўрабачання паказала першая праграма беларускага тэлебачання. Хто хваляваўся за Беларусь, той прыемна правёў вечар ля тэлевізара.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Гайнаўскі шпіталь з прыбыткам

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Калі ў краіне бурлілі пратэсты працаўнікоў медычнай службы, на Гайнаўшчыне царыла цішыня. Праўда, лекары і медсёстры гайнаўскай бальніцы падтрымлівалі пратэстуючых у іхняй (супольнай) справе, але актыўных дзеянняў у гэтым напрамку не праяўлялі. Пацыентам прыходзілася адно ў чарзе да спецыялістаў даўжэй пачакаць. Зараз усё прыйшло ў норму...

З уваходам рыначнай эканомікі Павятовы шпіталь у Гайнаўцы, зрэшты як большасць такога роду прадпрыемстваў медычнай службы, праходзіў своеасаблівы крызіс. Задоўжанасць дасягнула тады больш за тры мільёны злотых. Трэба было рашаць праблему: быць або не быць прадпрыемству. Варта адзначыць, што персанал гайнаўскай бальніцы меў належныя ўмовы працы. У 1996 годзе быў здадзены ў карыстанне комплекс новых будынкаў з сучасным шпітальным абсталяваннем. А перспектывы на рынку працы тады на Гайнаўшчыне былі мізэрныя. Працаўнікі бальніцы рашыліся на рэструктурызацыю. Гэта было ў 1998 годзе. Новая ўстанова атрымала назву: „Самастойнае публічнае прадпрыемства медычнай апекі" (SP ZOZ). Пачаткі аказаліся не надта ласкавымі, бо ніхто з тадышніх кіраўнікоў не меў рэцэпта як выйсці з фінансавага крызісу. У 2000 годзе на пасаду дырэктара і заадно менеджэра прызначаны быў Рыгор Тамашук. Гэта ён вывеў гайнаўскі шпіталь з задоўжанасці і зараз бальніца стала прыбытковай. Паслухайма затым аповеду дырэктара аб тым, як гайнаўскі калектыў дабіўся поспеху.

— У структурах нашага прадпрыемства знаходзіцца шэсць гмінных асяродкаў здароўя: Чаромха-Станцыя, Нараўка, Нарва, Белавежа, Дубічы-Царкоўныя і гарадская амбулаторыя. Апрача таго працуюць вясковыя медпункты ў Новым-Беразове, Старым Ляўкове, Семяноўцы і Ласінцы. Большасць будынкаў з'яўляецца нашай уласнасцю, але ў некаторых мясцовасцях арандуем будынкі ад гмінных самаўрадаў, або, як у Чаромсе, ад чыгункі. Нашымі паслугамі карыстаецца 23-24 тысячы падапечных. Працоўны калектыў налічвае 620 чалавек, у гэтым ліку 85 лекараў. Зарплата лекара ў сярэднім складае каля 2 000 злотых брута, а санітаркі — 1 400 зл. Апрача вышэйзгаданых цэнтраў медычнай апекі ў шпіталі знаходзіцца дзесяць спецыялістычных аддзяленняў ды трыццаць адна такая ж амбулаторыя, пачынаючы з аддзялення ўнутраных хвароб, а закончыўшы на рэабілітацыі. Спецыялістычнымі паслугамі карыстаюцца падапечныя з Чаромхі-Станцыі і Нараўкі. У чаромхаўскім асяродку раз у тыдні прымае неўролаг, псіхіятр і гінеколаг (раней прыязджаў і артапед), а ў Нараўцы — гінеколаг. Апрача таго ў чаромхаўскай амбулаторыі працаўнікі шпіталя бяруць кроў для аналізу ўзроўню цукру ў крыві. Варта адзначыць, што кошты з гэтым звязаныя нясе бальніца.

Дырэктар Рыгор Тамашук

— Скажыце, калі ласка, — звяртаюся да дырэктара Тамашука, — які бюджэт у Вас і як рэалізуеце задачы ў паслуговай ды інвестыцыйнай сферах?

— Сёлетні бюджэт гэта 30 мільёнаў злотых. З гэтага мы плацім працаўнікам зарплаты, пагашаем бягучыя рахункі ды адводзім неабходныя сродкі на мадэрнізацыю прадпрыемства. Варта адзначыць, што ў мінулым годзе перавялі мы ў новы будынак шпіталь інфекцыйных хвароб. Кошт інвестыцыі склаў 2,5 мільёна злотых і фінансавалася яна еўрасаюзнымі сродкамі і ўласным бюджэтам. Цяпер шпіталь шыкарна абсталяваны. У кожнай палаце знаходзіцца купальня з душам для пацыентаў. Гэта адзіная такога роду адзінка ў нашым ваяводстве. Два гады таму, — працягвае мой суразмоўца, — праводзілі мы рамонт хірургічнага аддзялення, які абышоўся нас у 150 тыс. злотых. Інвестыцыя была рэалізавана пакрысе з уласных сродкаў і пры дапамозе Павятовага старостваў ды шматлікіх спонсараў. Зараз праводзім рамонт артапедычнага аддзялення за суму 700 тыс. зл.

— Колькі хворых шпіталізуецца ў Вашай бальніцы ў гадавым маштабе?

— Каля дзесяці тысяч. Гэта многа, зважыўшы на тое, што карыстаемся адно 370 ложкамі. На дзіцячым аддзяленні маем 20 месц. Маці хворых дзетак маюць магчымасць прабываць у адмысловых пакоях ды карыстацца шпітальнай сталовай. Кошт харчавання не перавышае пятнаццаці злотых. Ёсць магчымасць пакарыстацца льготамі для шматдзетных і маламаёмных сем'яў. Праведзены будзе таксама рамонт гасцініцы для маці з дзеткамі.

— А якое зараз у Вас фінансавае становішча?

— Мінулы год закончыўся для нас прыбыткам велічынёю адзін мільён дваццаць тысяч злотых, — канстатуе дырэктар Рыгор Тамашук. — Спадзяюся прыбытку і ў гэтым годзе, але аб гэтым можна будзе гаварыць пасля заканчэння гадавога падліку.

— Вашы праблемы і пажаданні на будучыню?

— Асноўная праблема, — гаворыць дырэктар, — гэта малыя зарплаты лекараў і медсясцёр. Будзем хадайнічаць за гэта, каб па меры магчымасці забяспечыць іхнія патрабаванні. Намерваемся перавесці туберкулёзны шпіталь у новы будынак і купіць камп'ютэрны тамограф. Гэта каштоўная здзелка — 2,5 мільёна злотых. Пакарыстаемся еўрасаюзнымі сродкамі і банкавым крэдытам. Гэта перспектыва 5-6 гадоў. Робім гэта дзеля таго, каб справіцца з еўрасаюзнымі патрабаваннямі ды прыцягнуць спецыялістаў у нашае прадпрыемства. Прафесійныя кадры медработнікаў гэта аснова поспехаў, — сказаў на канец менеджэр гайнаўскага Самастойнага публічнага прадпрыемства медычнай апекі Рыгор Тамашук.

Кляшчэлеўскі самаўрад

У мінулым годзе кляшчэлеўскі самаўрад прызначыў са свайго сціплага бюджэту 1 733 тыс. зл. на інвестыцыі ды рэалізаваў пяць еўрасаюзных праектаў. Нягледзячы на гэта гміна падрыхтавала чарговыя еўрасаюзныя праекты і ў снежні мінулага года паслала ў Ваяводскую управу. А што было выканана ў рамках гэтых праектаў? Вось што сказаў мне на гэту тэму бурмістр Аляксандр Сяліцкі:

— Не ўсё ўдалося зрабіць. Рэалізавалі мы адзіную задачу паводле праекта „Гладышка традыцыі" коштам 700 тыс. зл. Асфальтавалі вуліцу ў Паграбах коштам 200 тыс. зл., праклалі водаправод да хутарных забудоў у салэцтве Сакі, паклалі тратуар у мястэчку ў рамках краёвага кантракта за суму 300 тыс. (прычым гміна з уласных сродкаў прызначыла 100 тыс. зл.). Канчаецца пабудова аўтамабільнай стаянкі побач агранамоўкі, якая каштавала 40 тыс. зл. Паколькі мінулагоднія праекты былі разгледжаны нетэрмінова (і з абмежаваннем фінансавых сродкаў на адзін праект не больш чым 4 мільёны зл.), дык на наступны год пераведзена рэалізацыя наступных задач: пабудова санітарных калектараў у Дабрывадзе і Кляшчэлях, рамонт вясковых святліц у Дабрывадзе і Палічнай, мадэрнізацыя дарог у Курашаве, Пятроўшчыне і дарогі Дабрывада — Рэпчычы (з адначасовай мадэрнізацыяй вуліцы Глуўнай у Дабрывадзе). Супольныя інвестыцыі са старостам гэта рамонт вуліцы ў Кляшчэлях, пабудова дарогі ў вёсцы Грузкая (з адначасовым даездам да ваяводскай дарогі Кляшчэлі — Сямятычы), асфальтаванне вуліц Кляшчэлеўскай і Каляёвай у Дабрывадзе. У пазнейшым тэрміне прадбачваецца аплікацыя пабудовы спартыўнай пляцоўкі ў Кляшчэлях і выкананне ацяплення мясцовага будынка школы. Бягучы год лічу затрачаным, — канстатаваў у заканчэнні размовы бурмістр Кляшчэль. — Можна было б зрабіць намнога больш, каб былі на гэта фінансавыя сродкі.

Бурмістр Аляксандр Сяліцкі

(ус)

Гарадок у вершах

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Гарадоцкае літаратурнае згуртаванне „Каласы” ўжо пастаянна збірае поўную глядзельную залу Гарадоцкага дома культуры імя Кастуся Каліноўскага на, здавалася б, малапрыцягальную для гледачоў падзею — завяршэнне тутэйшага, гміннага літаратурнага конкурсу. Ды гэта ўжо ў чацвёрты раз! „Кожны пісаць можа!” — пад такім лозунгам праходзіў гэты асенні паэтычны конкурс. У мокры лістападаўскі (24.XI.) вечар зышлася ў дом культуры процьма гарадчан, ды не толькі паглядзець і паслухаць, але і прыняць удзел у прамым галасаванні на найлепшых аўтараў, бо сёння ўсе гледачы былі членамі журы і ад кожнага голасу залежаў выбар, каму дастанецца паэтычны кубак войта Гарадоцкай гміны Веслава Кулешы. Гэта была дэмакратычная ідэя старшыні згуртавання „Каласы” Кастуся Казлоўскага. Мусіў выступіць кожны аўтар са сваім творам — ацэньвалася, так ці іначай, усё жывое выступленне. Вядома, публіка кіруецца сабе вядомымі прынцыпамі, бывае, што і насуперак прафесійным ацэншчыкам. Кастусь Казлоўскі намазгаваўся над усім спектаклем, бо пасля выступаў гарадоцкіх лірыкаў і сатырыкаў, таксама і аматараў з самога літаратурнага згуртавання, выступілі і ўсе „Каласы” са сваімі творамі, у лірычным асеннім спектаклі, аздобленым і пастаноўкай на верш нашаніўца з Гарадка Сцяпана Пятэльскага-„Арла”. З музыкай, адмысловым сцэнічным рухам, касцюмамі. Вось на тое і ішла гарадоцкая публіка, на той слоўна-тэатралізаваны спектакль, ужо „выхаваная” самімі аўтарамі, што будзе не толькі што нянудна, але і вельмі цікава. Бо выступяць і дзеці, і моладзь, і дарослыя, усім вядомыя з выступленняў нават ад больш за 50 гадоў, як Ніна Цыванюк і Анатоль Парэмбскі, чые творы вядомыя таксама і з „Гарадоцкіх навін”, дзе друкуюцца — папольску і па-беларуску...

— Ударылі Залукі! — падагуліў яшчэ да пачатку мерапрыемства Кастусь Казлоўскі, пералічваючы спісак выступаючых аўтараў тэкстаў. Заявіла свае творы 34 асобы. — Сярод дзяцей хутчэй пералічыш, хто не з Залук: Эвеліна Лапінская, Эліза Моніка Байсіцкая ды Мілена Лапінская. Рэшта — Ася Мінчук, Агата Каранкевіч, Крысь Назарук, Наталля Паплаўская, Патрыцыя Карлуў, Аня Паплаўская, Кася Мойсак, Каміль Альшэўскі, Магда Станкевіч, Юстына Варановіч — усе залучанскія. І з гарадоцкай гімназіі васьмёра — Беата Адамюк, Бася Раманюк, Эвеліна Малеша, Сільвія Госцік, Лукаш Зіневіч, Ася Адамчык, Аляксандра Карпюк, Аня Трахімчык...

Хоць прынцып ацэньвання вельмі падабаўся раней крыху разгубленай публіцы, на жаль, не ўсе творы маглі прымацца пад увагу публікі, паколькі вялікая частка гімназістаў з-за непрысутнасці не магла выступіць на сцэне з уласнымі творамі. Вучні выехалі былі ў той дзень на спартыўныя спаборніцтвы, і іх творы нават не чыталіся са сцэны. Шкада! Асабліва, што сярод іх ёсць выдатныя дэкламатары, між іншым, Оля Карпюк. Так вось усе дзеці, стаўшы радком, з нумарамі або літаркамі на школьных фартушках (Залукі!), вынеслі свае творы ва ўласным выкананні на суд публікі. Сярод гімназістаў з творам на беларускай мове выступіла Аня Трахімчык, якая і перамагла. У групе вучняў пачатковых школ публіка найлепш ацаніла Юстыну Варановіч.

„Каласы”. З кубкамі пераможцаў Г. Ляховіч і М. Врублеўская

Ніна Цыванюк, Анатоль Парэмбскі, Галінка Ляховіч

Дарослыя аўтары вядомыя ўсім гарадчанам перш за ўсё выступленнямі на гмінных мерапрыемствах, такіх як дажынкі, Купалле, Дзень нараджэння Гарадка, „Сяброўская бяседа”, таксама і музычных. З новымі творамі выступілі Галіна Сянкевіч, Янка Грыцук, Адам Застоцкі, Раман Іванюк, Радаслаў Данік, Віёла Чосткуў, Дарыюш Кандрацкі ды Марыя Врублеўская, а па-беларуску — Ніна Цыванюк (*дарагі Гарадок, браток ты мой!*), Анатоль Парэмбскі і Галінка Ляховіч. „Добрае слова ніколі не раніць, добрае слова вартае многа, асабліва калі яно шчырае ды падтрыманае ўчынкам”, — падагульваў вядучы конкурс, усё лепш адчуваючы сябе на сцэне і з мікрафонам Кастусь Казлоўскі, што апрацаваў увесь сцэнарый пастаноўкі, якую не пакінуў ні адзін глядач. Слухачы падышлі да справы вельмі сур’ёзна: трэба было ад каляровых лістоў адшчыкнуць нумары або літаркі, якімі пазначаны былі выступоўцы і справядліва ацаніць такім чынам. Найбольш галасоў атрымалі Марыя Врублеўская і Галінка Ляховіч.

— Пішу пра тое, што памятаю і што бачу, — сказала Ніна Цыванюк перад сваім сумным вершам пра рэчаіснасць. *Мы сведкі дваццатага стагоддзя, прайшоўшых войнаў, ветраў і паводкаў — бяды, гора, нядолі і вызвалення ад няволі. Мы сведкі разбуранай айчыны...* Другое сведчанне лёсу свайго і свайго пакалення ў Гарадку даў Анатоль Парэмбскі: *Ад пяць вякоў, пакуль існуеш, былі ўзлёты і ўпадкі. Гарадок усё добра знае, якія мае недастаткі... Гісторыя твая багата. Як на руцэ твая ўся доля: мала калі бывала свята, а больш гароўка і няволя.* Проста — *Таке часы*, як назваў верш пажылы паэт-селянін са Станцыі-Валілы.

Галінка Ляховіч, вядомая гледачам і слухачам як непераўзыдзеная сатырычная актрыса-спявачка, з вялікім хваляваннем прачытала свой беларускі верш, напісаны ў свае чатырнаццаць гадоў, пра Гарадок, які бачыла дзіцячымі вачыма, і заваявала сэрцы слухачоў-камісіі, якія амаль аднагалосна далі ёй першую прэмію. *Гарадок — мая айчына, дзе жыву ўжо многа лет. Ці ёсць яшчэ дзесь такая мясціна? Напэўна — не знойдзеш на цэлы свет! У гэту „метраполію” я прыехала жыці, калі мне было ўсяго чатыры лет. Я не ўмела яшчэ папольску гаварыці, а па-нашаму навучыў мяне дзед. У дзяльніцы Пяскі мне жыць пашанцавала; яна самай багатай, здаецца, была: асяродак здароўя, аптэка, школа, Геэс, фабрыка Каро, ну і гаспода Усходняя — усё пад рукою, быццам маці мая. Каб быць справядлівай, трэ ўспомніць і пра Мяшчанаў — бо гэта ж другая часціна Гарадка. Там вялікім атутам былі банк, Дом культуры, а трошкі далей — парк, ВОП, касцёл і царква. Хата, у якой жыла я, была невяліка, ды дзіцячыя вочы бачылі манумент! Такіх хацін было ў Гарадку без ліку, а перад вайною ў ім быў яўрэйскі акцэнт. Як я ганарылась Супрасляйракою, — яна для мяне проста Віслай была! У час летніх вакацыяў я з сяброўкай сваёю* (я думаю — яна напэўна сёння ёсць!) *найпрыгажэйшыя хвіліны над ёй правяла. Праляцелі хутка гады маладыя, а па маёй хаце і следу няма... Толькі яблыня, пасаджана рукой майго бацькі, не ведаю, якім цудам яшчэ расце ацалелая. Часта ў думках сваіх цябе ўспамінаю, дарагі браток, Гарадок ты мой! Я табе шчыра, ужо сёння, абяцаю, што ніколі ў жыцці не расстанусь з табой!*

„Памятаем і чытаем” — вялікі конкурс „Нівы”

Праграмная рада тыднёвіка „Ніва” аб’яўляе конкурс пад загалоўкам „Памятаем і чытаем”, прысвечаны дзвюм знамянальным, на нашу думку, гадавінам, якія будзем адзначаць у 2008 годзе. Першая — гэта 90-я ўгодкі абвяшчэння 25.03.1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі і другая гэта 50-я гадавіна заснавання ў Беластоку 8.06.1958 г. Беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа”. Адказы на пытанні просім дасылаць да 5 сакавіка 2008 г. на адрас нашай рэдакцыі з прыпіскай «Конкурс „Памятаем і чытаем”». У конкурсе могуць прыняць удзел усе жадаючыя, незалежна ад месца пражывання. Адказы можна дасылаць па звычайнай і электроннай пошце. Не забудзьце напісаць нам свой хатні адрас для карэспандэнцыі. Аўтарам найлепшых і найцікавейшых адказаў арганізатары падрыхтуюць адмысловыя ўзнагароды.

Конкурсныя пытанні

1. *Які герб і сцяг быў прыняты Беларускай Народнай Рэспублікай?*

2. *Назавіце прозвішчы і імёны ўсіх былых старшынь Рады БНР.*

3. *Назавіце гарады, у якіх знаходзілася сядзіба БНР.*

4. *Дзе зараз знаходзіцца Рада БНР і хто ёй старшынствуе?*

5. *Як называецца першы зборнік членаў беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа”, калі пабачыў ён свет і пад чыёй рэдакцыяй?*

6. *Як называюцца літаратурныя альманахі аб’яднання ў мінулым, а як цяпер? Колькі нумароў выйшла кожнага з іх?*

7. *Хто цяпер з’яўляецца старшынёй „Белавежы” і дзе ён нарадзіўся? Назавіце ягоныя тры першыя паэтычныя зборнікі на беларускай мове.*

8. *Назавіце трох „белавежскіх” паэтаў і трох празаікаў ды апошні зборнік кожнага з іх.*

9. *Мае разважанні на адну з дзвюх ніжэйпададзеных тэм:*

— Людзі, падзеі, ідэі БНР учора і сёння;

— Мой „белавежац” або ягоны твор, які падару блізкім.

Можа быць гэта эсэ, літаратурная мініяцюра, паэтычнае прысвячэнне (усё памерам максімум да дзвюх старонак машынапісу). Могуць быць таксама і працы пластычнага кшталту, выкананыя адвольнай тэхнікай.

„Памятаем і чытаем” — адказаў чакаем да 5 сакавіка 2008 г.

Рэдакцыя „Нівы” — тыднёвіка беларусаў у Польшчы

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

НАША „МУХА” НА ЦІП-ТОП!

Пра славутасць, мабыць, і не думалі „Трускаўка” ды „Лёльця”, а прыйшлося! Паказаліся перад большай публікай, тэлекамерамі, мікрафонамі на прамоцыі „Мухі ціп-топ” у Ваяводскім асяродку анімацыі культуры. Было мора кветак і віншаванняў. Самі гераіні выступілі перад публікай, дзе былі і прататыпы герояў, і іншыя музы — бацькі, дзяды з бабулямі, настаўнікі ды іншыя спрыяльнікі таленту Наталлі і Олі. Быў нават рэктар ды палітык, Міхась Лісоўскі, які калісьці быў таксама „Зорчыным” аўтарам вершаў ды малюнкаў і прызнаўся, што надалей з’яўляецца яе аматарам. Мерапрыемства вялі Ганка і Матвей, якія распавялі пра кулісы ўзнікнення гэтага твора ды распытвалі аўтарак пра сакрэты пісьменніцка-мастацкай кухні, а таксам выклікалі „да дошкі” іх выхавацельку ды „паню Зорку”.

Сяброўкі аўтарак „Мухі ціп-топ” Олі і Наталькі — самыя верныя чытачкі

яны самі хацелі сказаць. Пра „Трускаўковую ляску”, іначай Наталёзу і яе адносіны з субкультурамі — пакемонаў, хіпі, металаў, растаманаў, Эма, рокерсаў... Пра Олю, „Каліначку”, шукалі нават на Вікіпедыі, ды знайшлі на сайце *ściąga.pl* — пра яе характар, інтэлігентнасць, творчасць... Так ці іначай — дзяўчаты асацыююцца з „дзяцьмі з дзіцячага садка”, вядома, н-р 14 у Беластоку, беларускага. І прызналіся вядучыя калегі маладых мастачак, ад імя іншых сяброў (м.інш. Олі М.), якое значэнне для моладзі мае іх пачын і звычайная прысутнасць у іх свеце: „Олька, ты малы фраглесе, дзякуючы табе магу выйсці ў адной балерынцы і адным чырвоным гляне, не думаючы пра тое, што пра мяне падумаюць іншыя!”. А Магда С. сказала: „З імі можна рабіць усё, нават напіцца марцыпанавага мерсі!”

На сустрэчы паявіліся і „прататыпы” герояў з рознымі характарамі (злосную дырэктарку Воўк бравурна адыграла Ілона Карпюк), хоць персанажы з’яўляюцца па сутнасці больш сукупнасцю

Сяброўскае канферансье ў выкананні Ганкі Пякарскай і Матвея Севастыяніка

Бабулі Наталькі: (злева) Марыя і Марыянна, спецыяльна прыехалі ў Беласток

І амаль пра ўсё даведаліся мы: як і калі пісаліся апавяданні, на... якіх уроках і ў якую пару (нават ноччу!) маляваліся выявы герояў і падзей („таму мы маглі пабачыць усё раней, пакуль паспелі сабе што-небудзь уявіць!”). Кніжка праз два дні ад выхаду стала гітам, калегі, якія не ведаюць беларускай мовы, прасілі дзяўчат перакласці ім гісторыі. „Можа, каб лепш і не ведалі?!” — смяяліся аўтаркі, якія, мабыць, і спалохаліся, што выявілі зашмат сакрэтаў гімназічнага жыцця. Ды і пра іх саміх, вучаніц беластоцкай Гімназіі н-р 7, слухачы многа даведаліся — часам больш, чым

Бацькі аўтарак з класнай выхавацелькай (усярэдзіне) уважліва чытаюць кніжку

некалькіх асоб. Хто ж тут той проста неверагодны Міколка? — азіраліся госці. Ці сапраўдная гэта гісторыя, якую можна перакласці так: „Mucha Nie Siada”? Можна ставіць пытанні, прачытаўшы з цікаўнасцю ўсю кнігу. Файная кніжачка, проста на ціп-топ! І выглядае як асабісты мемуарны альбомчык, такі, у які ў юнацтве ўсе збіраюць аскепачкі свайго жыцця — эскізы, зарысоўкі, аўтографы, здымкі аднагодкаў, пажаданні... І мы жадаем аўтаркам на пачатку іх творчага шляху, каб быў ён хай і звілісты, круты і пад вецер, ды ўперад, увысь!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Смех не грэх!

Моладзь, слова простае, аднак многа праблемаў з гэтымі людзьмі! Бацькі маладых людзей лічаць, што мы павінны быць сур'ёзнымі. І ў гэты момант узнікае праблема. Мы, маладыя людзі, цешымся, што перад намі цэлае жыццё і што ў нас мала праблемаў. На жаль, дарослыя забываюць, што яны таксама былі малыя, што ў маладыя гады мае права падурэць. Многа разоў мы з сябрамі мелі праблему з пакупкамі ў краме толькі таму, што мы смяяліся, бо ў нас быў добры гумар. Вельмі добрым прыкладам гэтаму з'яўляецца гісторыя, якая здарылася месяцы два таму...

Мы з сябрамі паехалі ў Бельск-Падляшскі на „Бардаўскую восень". Калі мы вярталіся з канцэрта да маёй бабулі, мы і „наш добры гумар" зайшлі ў краму. Мы не ўзялі з сабой кошыкаў, толькі з усмешкай на вуснах пайшлі ў залу і шукалі на паліцах ежы. У пэўны момант мы задрыжэлі! У краме прагучаў страшны голас. Гэта была прадаўшчыца, якая сцерагла гэтую краму. Да нас далятаці варожыя словы. Мы зразумелі, што наша прысутнасць тут непатрэбная і найлепш было б, калі б мы самі хуценька выйшлі з крамы. Мы так і зрабілі...

На наступны дзень мы зноў зайшлі ў гэтую краму. Кожны з нас купіў па адным лізуне, па 20 грошаў штука. Мы яшчэ папрасілі рахунак. Між сабой мы размаўлялі на беларускай гаворцы. У час другога дня „Бардаўскай восені", на перапынку, калі прагаладаліся, мы зноў збегалі ў „нашу" краму. І тут нас сустрэла дзіўная перамена, нас прывіталі... цёпла. Калі мы выходзілі з крамы, пачулі як наша любімая прадаўшчыца сказала:

— Прабачце, што ўчора я на вас накрычала! У мяне быў кепскі гумар. Я ўжо ведаю, што вы сімпатычныя людзі...

Мы развіталіся і думаем, што нас добра запамяталі ў гэтай краме. Таму прашу вас, дарослыя: бабулі, дзядулі, мамулі, татулі, цётачкі, дзядзечкі, успамінайце як было ў вашы маладыя гады. Жадаю, каб вам заўсёды спадарожнічаў фрагмент верша Віктара Шведа:

Смех не грэх, усім вядома,
Смех здароўе, асалода,
Дык у хаце, працы, дома,
Трэ смяяцца нам заўсёды!

Ганка ПЯКАРСКАЯ (Акно)

Рэдакцыя „Акна". У першым радзе злева: Лукаш Зіневіч, Ганна Пякарская (галоўны рэдактар), Марыюш Франкоўскі; стаяць: Аня Назарук, Марта Бялеўская, Івона Баршчэўская

Гарадок

Гарадок, Гарадок,
я цябе так люблю:
Роднай мовы словы
і гумар вясковы,
Нашу царкву і песні гора —
Гэта майму сэрцу падпора —
Залатых купалаў бляск
і зялёны наўкруг лес.

Гарадок, Гарадок, я
цябе так люблю.
І хачу астацца тут назаўсёды.
З табой, мой родны кут.
Казак хачу слухаць
і песні хачу чуць,
Глядзець як нашай рэчкі
нурты спакойна бягуць!

Аня ТРАХІМЧЫК
Гімназія ў Гарадку (Кампот)

малюнак Элі Коршак (Кампот)

Музыка з кайфам

Варта заўсёды чакаць... гурту „Тарпач"

Энергія, стыль ды супраціўленне — гэта словы, якія акрэсліваюць адзін з беларускіх, маладых гуртоў. Спадзяюся, што ўсе зразу здагадаліся пра каго можна сказаць так няшмат, а прытым поўнасцю перадаць натуру гэтай з'явы. Можа яшчэ субтыльнасць, але гэта маё ўражанне ад вакалістак гурту, бо яна скрываецца пад паводзінамі цвёрдых, баявітых дзяўчат. Кажу ў множным ліку, бо ў гісторыі гурту **„Тарпач"** паяўляюцца дзве вакалісткі. Цяпер з гуртом працуе Вольга Самусік, якая адначасова спявае ў гурце „Жыгімонт Ваза" і працуе журналісткай „Музыкальнай газеты". Але пачатак гурту цесна звязаны з асобай Светы Сугакі, з якой гурт у 2004 годзе стаў упершыню лаўрэатам фестывалю „Басовішча". Света захапіла ўсіх натуральнасцю жорсткага пераказу, але таксама „творчым" выглядам. Добра помню адну з цікавейшых сустрэч са Светай. У час падарожжа на мінскі „Байк-шоў" спыніліся мы з сябрамі ў Мінску на адну ноч. У цэнтры горада, амаль побач прэзідэнцкага палаца, куча людзей іграла і спявала з нагоды дня нараджэння расійскай вакалісткі Земфіры. Захапіла нас гэта знянацку, а Света захапляла як заўсёды. Гаворачы пра «першы „Тарпач"» немагчыма не ўспомніць адной важнай цікавінкі. 10 снежня 2007 года адбылася прэм'ера фільма Мірка Дэмбінскага „Музычная партызанка", які паўставаў на працягу апошніх трох гадоў. Фільм смутны, вясёлы, іранічны, а яго героямі з'яўляюцца перш за ўсё... Света і „Тарпач"!

Вольга ўнесла ў гурт новую якасць. Вядома, у пэўным сэнсе працягваецца характэрная стылістыка мінскай каманды і, здаецца, для іх гэта пазітыўна. У час сёлетняга фестывалю „Басовішча" таксама паказалі, што іх месца на сцэне.

i_basovka@o2.pl

Камп'ютэры і тэлевізары

Сёння ў кожнай хаце камп'ютэр і тэлевізар. Многа людзей амаль цэлы дзень праводзіць пры гэтых абсталяваннях. Ці гэта добра? Напэўна — не! Камп'ютэры і тэлевізары патрэбныя і дапаможныя для людзей, але вельмі шкодныя для іх вачэй. Таму трэба абмежаваць карыстанне камп'ютэрам, найлепш да адной гадзіны ўдзень. І, можа, лепш чым глядзець тэлевізар, прачытаць кніжку або газету. Гэта можа дапамагчы ўзбагачаць і развіваць мову, пазбягаць граматычных памылак. Гэта можа прывесці да самых лепшых ацэнак з дыктовак.

Думаю, што людзі, якія чытаюць кніжкі і газеты, духоўна багацейшыя за тых, якія глядзяць тэлебачанне і гуляюць на камп'ютэры. Яны мудрэйшыя і маюць большую фантазію. Запамятайце! Варта чытаць кніжкі, а не толькі глядзець фільмы і гуляць у камп'ютэрныя гульні.

Марыюш ФРАНКОЎСКІ (Акно)

Польска-беларуская крыжаванка № 52

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 48: Маг, прыгода, прырода, грыб, рама, лаза, араб, луг, код, шаг, рай. Мёд, глуш, прага, прыз, рыбак, сыр, Об, горад, водар, дама, на, абой.



Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Паўліна Дзмітрук-Лапінская, Эвеліна Іванюк, Марта Зінчук** з Гайнаўскага белліцэя, **Магда Мэкроўда, Гося Карнілюк** з Гайнаўкі (Гімназія н-р 2), **Паўліна Багацэвіч** з Крывятыч, **Паўліна Іванюк** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Анішчук, Карына Марта Гіншт, Кася Сэвастыянік** з Чыжоў. Віншуем!

Беларуская асвета ў Латвіі (2)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Беларускае школьніцтва ў Латвіі і Літве можна параўнаць да нашай сітуацыі ў Беластоку. Яно адрадзілася на хвалі дэмакратычных перамен пасля 1989 года. І што здзіўляе, нягледзячы на ангажаванасць і намаганні, беларусы Рыгі, Вільні ці Беластока здольны назбіраць у адзін клас прыблізна па 10 асоб. У гэтай агульнай з'яве можна пабачыць кур'ёз. Хоць у Латвіі і Літве маюцца асобны будынак і беларускамоўныя кадры, школьніцтва хіліцца ў бок заняпаду. У нас, наадварот, беларуская мова прысутная ўжо на ўсіх адукацыйных узроўнях — ад дзіцячага садка па універсітэт. Паколькі найбольшае зацікаўленне навучаннем назіраецца ў дзіцячым садку (ад двух гадоў не хапае месца для ўсіх ахвотных), можна гаварыць пра перспектыўнасць. Праўда, беларуская мова на ўзроўні пачатковай школы, гімназіі і ліцэя выкладаецца як дадатковы прадмет для добраахвотнікаў. Заняткі часта адбываюцца з самой раніцы або пасля ўрокаў. Для гэтага адведзеныя залы ў польскіх школах, адрамантаваныя і абсталяваныя за кошт бацькоў.

Пішу пра гэта, бо прыклад Рыгі і Вільні паказвае, што беластоцкі варыянт гэта свайго роду беларускі адукацыйны кампраміс. Хоць у Літве і Латвіі ўрокі матэматыкі ці хіміі можна весці на беларускай мове, школы „добраахвотна" пераключыліся на дзяржаўныя мовы. У Рыжскай беларускай асноўнай школе ўсе прадметы (апрача беларускай мовы і заняткаў па мастацтве) вядуцца на латышскай і... рускай!

— На беларускай мове выкладаем прыблізна 10 працэнтаў прадметаў, — кажа Анна Іване, дырэктар Рыжскай беларускай асноўнай школы. — Гэта: беларуская мова, маляванне, візуальныя заняткі ў пачатковай школе, элементы краязнаўства. Прытым на вывучэнне роднай мовы адводзіцца тры гадзіны штотыдзень, латышскай — чатыры, а ў дзевятым класе — пяць гадзін. У Латвіі пашыранае білінгвальнае навучанне, — адзначае дырэктарка, — прадмет выкладаецца адразу на дзвюх мовах. Настаўнік і вучні карыстаюцца латышскімі падручнікамі, якія на хаду перакладаюць на рускую мову або наадварот.

Чаму такая „непатрыятычная" практыка?

— Усё дзеля экзаменаў, — кажа Анна Іване, — у нашых навучэнцаў няма дзе здаваць экзамены на беларускай мове.

* * *

Тацяна Казак, старшыня згуртавання „Сьвітанак", з сантыментам успамінае пачаткі школы, калі амаль усе прадметы выкладаліся на беларускай мове.

— Я сама вучылася ад сваіх хлопцаў матэматычных тэрмінаў, — кажа.

Тады на калідоры ці ў сяброўскай кампаніі паўсюдна гучала беларуская мова. Чаму няма працягу такой тэндэнцыі? Чаму ў беларускай школе не сустрэнем бел-чырвона-белага сцяга і нацыянальнай сімволікі? Адказаў многа. Школа паўтарае асіміляцыйныя працэсы ў Беларусі, ад якой ментальна і арганічна залежная. Да гэтага спрычыняецца такгадоў пражывання, рашаюцца вярнуцца на бацькаўшчыну. Трэцяя, не менш істотная справа — унутранае сама палітыка Латвіі. Беларусы, якія ў значнай масе не маюць латышскага грамадзянства, жывуць з „дня ў дзень". Многія з іх, пасля разбіццё беларускага руху. Наколькі ў першыя гады ў незалежнай Латвіі беларускія справы вырашала дэмакратычная суполка „Сьвітанак", настолькі зараз усё большую ролю ў Латвіі адыгрываюць так званыя „праамбасадаўскія" суполкі, якія падтрымваюць лінію афіцыйнага Мінска. Пры ўсіх складанасцях і падзелах, пры жорсткай асіміляцыі беларусы Рыгі як агню баяцца закрыцця сваёй школы. Пагроза ліквідацыі тут рэальная з-за недастатковай колькасці вучняў.

— Каб заснаваць клас, патрэбна 15 асоб, — кажа Анна Іване, — а ў нас толькі ў адным класе вучыцца такая колькасць. Дагэтуль улады прымыкалі вока на нашы недахопы. Зараз у краіне наглядаецца дэмаграфічны пік, асабліва не хапае месца ў дзіцячых садках. Будынак, дзе знаходзіцца беларуская школа, у палове прыналежыць прадшколлю. Тут плануецца пашырыць садок. Лёс беларускай школы невядомы. Праўдападобна далучаць яе да нейкай рускай асноўнай школы, у якой паменшылася колькасць вучняў.

Пра апошнія планы беларусы даведаліся з прэсы!

— Мы ўжо тры разы мянялі месца, — кажа Тацяна Казак, — і ў выніку гэтых перасяленняў мы заўсёды гублялі сваіх вучняў.

— А як вашы бацькі ўспрымуць змену?

— Яны будуць супраць, — кажа Анна Іване. — У школе працуюць вельмі адукаваныя настаўнікі. У нас высокія вынікі навучання, таму што ў нас маленькія класы, да кожнага можна падысці індывідуальна. Усе цэняць хатнюю атмасферу. Мы ведаем усіх дзяцей па імені і прозвішчы, бацькоў...

Факт, у школе на 86 вучняў працуе аж 19 настаўнікаў!

— Кожны год нашы вучні маюць добрыя вынікі на гарадскіх алімпіядах па геаграфіі, матэматыцы, рускай і латышскай мовах, — працягвае дырэктарка. — У мінулым годзе ўсе атрымалі атэстат і прайшлі экзамены ў коледжы і школы. Гэтым ганарымся.

Анна Іване

* * *

У вольны час, яшчэ да сустрэчы з загадчыцай школы, я мела магчымасць пакарыстацца Інтэрнэтам. У школе прыстойны камп'ютэрны кабінет. Заняткі па інфарматыцы вядуцца ў старэйшых класах, для іншых школа адкрыла гурток. Абсталяванне спансаравала Міністэрства адукацыі Латвіі.

— А якая дапамога з боку Рэспублікі Беларусь?

— Мы правялі грунтоўны рамонт за кошт беларускай дзяржавы. Беларусы выдаткавалі дзесяць тысяч долараў, на гэты час вялікія грошы, — інфармуе Анна Іване. — Маем таксама кніжную дапамогу, атрымоўваем падарункі на вечарыны і Каляды. Нашы дзеці маюць магчымасць адпачываць у беларускім летніку „Зубраня" на Нарачы. Маем і візавую падтрымку.

Апошняя справа найважнейшая ў Прыбалтыцы. Беларуская віза для грамадзян Беларусі каштуе 60 латаў, гэта прыблізна 120 долараў. Неяк выпадкова ўсе беларускія размовы ў Рызе і ў Вільні круцяцца вакол беларускіх віз. Але гэта асобная тэма.

Частка садка, дзе знаходзіцца беларуская школа

(працяг будзе)

У Орлі гралі з яўрэямі

Тэкст і рэпрадукцыя здымка Міхала МІНЦЭВІЧА

Добраахвотная пажарная каманда ў Орлі адзначае 85-годдзе сваёй дзейнасці. Варта прыгадаць і падкрэсліць, што найвыдатнейшы перыяд у яе гісторыі выпадае на міжваенныя гады, калі ў ліку пажарнікаў былі яўрэі. У тую эпоху пажарнікі не толькі тушылі пажары, але таксама былі авангардам мясцовага культурнага жыцця. Тыя традыцыі абарваліся і нават не кожны пра іх ведае. Адкуль узялася ў Орлі музыка?

Пра любоў яўрэяў да музыкі сведчыць даваенная Орля, у якой яўрэі складалі 80% насельніцтва. Гэта дзякуючы ім у санацыйны перыяд узнік і дзейнічаў у Орлі духавы аркестр пажарнікаў. Камендант пажарнікаў выводзіўся ў той час з багатай яўрэйскай сям'і Вайштэйнаў, якая валодала арлянскай кафлярняй (і меншай бельскай). Пра прагу грамадскай дзейнасці ў яўрэйскім асяроддзі сведчыць і тое, што пажарнікі выводзіліся з багацейшых сем'яў, напр., уладальнікаў пякарні, гарбарні ці цырульні. Без музыкі не магло ў яўрэяў адбыцца вяселле, аднак — інакш чым у хрысціян — за сталом яны не спявалі.

Маладому і сярэдняму пакаленню жыццё ў даваеннай Орлі вядомае толькі з расказаў продкаў. Зараз і старэйшыя асобы, ідучы следам законаў прыроды, забываюць пра мінулае і ўсё меншае лік жывых сведкаў таго часу. За адыходам людзей адыходзіць і гісторыя. Ды і не ўсе хацелі або ўмелі вяртацца ўспамінамі ў той час, але тыя, што пакінулі ўспаміны нашчадкам, пакінулі мясцовай гісторыі неацэнныя каштоўнасці.

Сёння, калі культура ў Орлі не мае той дынамікі, што раней (нават з 1960-80-х гадоў), і папросту чахне, а яе аніматараў адчуваецца (гэтаму прыкладам і мая асоба), не ўсе ўсведамляюць, што тут на працягу многіх — як жа складаных — міжваенных гадоў вельмі актыўна дзейнічаў пажарны духавы аркестр. Вайна спыніла гэтую прыгожую традыцыю. Асталося адно некалькі пажаўцелых здымкаў і запісаныя мною ўспаміны сяброў аркестра — Аляксандра Карнеева, Міхала Шыманскага і Аляксандра Кубаеўскага ды служачай у яўрэяў Наташы Камарчук (Пятроўскай). Хаця ўсе мае героі ўспамінаў адышлі ўжо ў лепшы свет, аднак у маім архіве асталіся ўсё жывыя іхнія расказы. Хачу падкрэсліць, што кожны адрэзак магнітафоннай стужкі мне вельмі каштоўны. Бо з яе чуваць голас, нават дыханне расказчыка. Такая стужка — гэта чалавек!

На адзінай захаванай Аляксандрам Карнеевым фатаграфіі аркестра з 1930 года, вядома, што ў яго складзе былі (стаяць, злева): Эршуль Мікляцкі (жыў па сённяшняй вуліцы Крывой), Аляксандр Карнееў, Аляксандр Ярымовіч (пасля другой сусветнай вайны працаваў загадчыкам у канцылярыі прэм'ер-міністра Пятра Ярашэвіча), Зэйтка Фельрэгер (быў цырульнікам у цэнтры Орлі, дзе зараз кафэ Хмялеўскага), Косця Мураўскі, Міхал Альшэўскі (пасля вайны жыў у Гродне, пазней ампутавалі яму ногі) ды (сядзяць, злева): Аляксандр Мартыновіч (мясцовы, ягонай першай жонкай была яўрэйка), Метак Радзеванюк (быў выхаванцам „ахранкі"), Уладзіслаў Акушка, Шэйкін Тапалянскі (меў кардачасальню, жыў побач царквы) і Цымбал Монашка (меў пякарню ў рыначку).

Пачаткі пажарнай каманды

Добраахвотная пажарная дружына ў Орлі паўстала ў 1922 годзе, а першым яе камендантам быў Фама Нестаровіч. Пазней камандавалі ёю Вайштэйн — сын уладальніка кафлярні, Дэмбіцкі — загадчык школы і Мікалай Хурса. Неўзабаве быў заснаваны пажарны духавы аркестр, аб прыёме да якога вырашаў лекар пасля абследавання лёгкіх з мэтай даведацца ці кандыдату хопіць сілы дзьмуць у карнет або іншыя інструменты. Кандыдаты адначасна станавіліся пажарнікамі. Аляксандр Карнееў пажарнікам стаў у дваццацігадовым узросце; пазней у аркестр траплялі яшчэ малодшыя.

І пажарнікі, і музыкі дружна супрацоўнічалі, без аглядкі на веравызнанне. Вучыў пажарнікаў і дырыжыраваў аркестрам настаўнік Уладзіслаў Акушка, родам з Бельска. Як і кожны адказны аркестр, пажарнікі мелі свой пастаянны рэпертуар для дзяржаўных урачыстасцей і на забавы. Вельмі часта іграли на яўрэйскіх вяселлях — пад гукі марша праводзілі маладую пару і вясельны карагод, а пасля гралі на танцах, найчасцей у будынку яўрэя Вадзілоўскага, дзе была сцэна. У тым самым будынку (па вуліцы Бельскай, які згарэў у час вялікага пажару ў 1938 годзе; сёння гэта пляц Амеляновічаў) Вадзілоўскі трымаў краму. Калі жаніўся калега пажарнікаў, аркестр граў дармова.

Яўрэі на вяселлі гарэлкі амаль не пілі. Выпівалі не больш чым паўкілішка і на ўсё вяселле хапала ім паўлітроўкі. Музыкантам, як успамінаў Карнееў, гарэлкі (два літры на дванаццаць чалавек) і закускі (тушанай гусяціны) не шкадавалі. На вяселлі някепска плацілі, да таго ж быў звычай, што танцоры за кожны танец дакладалі па пяцьдзесят грошаў. У рэпертуары аркестра былі маршы, танга, вальсы, полькі. У той час нельга было іграць румбу.

Як успамінала Наташа Камарчук, яўрэі бралі шлюб на пляцы перад бажніцай. Вянчаў рабін. Маладая мела закрыты твар і калі звянчаліся, здымалі тую хустку і малады мог пабачыць, каго ўзяў. Калі жаніўся бедны яўрэй, яму дапамагалі іншыя. У яўрэйскай школе збіралі ім грошы на пачатак. За вясельным сталом ніхто не бачыў п'янага яўрэя. Быў аранжад, шампанскае або па кілішку кашэрнай гарэлкі. Было шмат пірожнага і цукеркаў. Яўрэі за сталом не спявалі.

У турму за палітыку

У трыццатых гадах арганізавалася ў Орлі ячэйка Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Яе членамі сталі некаторыя музыканты, якіх неўзабаве ў аркестры не стала. Прычыніліся да гэтага правакатары з Крывой і Гусакоў. Апошні пранік у ячэйку, быў на падпольным сходзе ў „Боры" — ляску каля Орлі — і ўсіх выдаў паліцыі. Тым, якія адпіраліся ад камуністычнай прыналежнасці, падкідалі ў хаты нелегальныя лістоўкі і такім чынам „даказвалі ім віну"; трапілі яны ў турму. А калі некаторыя яўрэі выехалі з Орлі, аркестр яшчэ больш парадзеў. З музыкаў у турму трапіў за палітыку м.інш. Костэк Мураўскі, якому засудзілі сем гадоў, з якіх тры адседзеў; пасля вайны даслужыўся ён звання палкоўніка, пахаваны ў Познані.

За палітыку ў той час сядзелі таксама асобы з-па-за аркестра, м.інш. Куптэль, які ў войску скончыў медыцынскія курсы і стаў санітарам, а тут адседзеў тры гады. І што цікавае — у турме атрымаў ён фельчэрскія дакументы! У Орлю вярнуўся — як прыгадваў Карнееў — з доўгай барадою. Стаў ён добрым спецыялістам і пасля вайны паспяхова канкурыраваў з арлянскім лекарам Міхалам Раўбам, які меў званне доктара. У Куптэля было многа пацыентаў і лячыў ён іх яшчэ ў 1960-х гадах.

За палітыку пасядзеў шэсць гадоў у турме і яўрэй Ляцкі, які быў хваленым людзьмі дантыстам. Жыў ён насупраць царквы па сённяшняй Кляшчэлеўскай вуліцы. У яго было двух братоў, адзін з якіх быў рахункаводам у кафлярні Вайштэйнаў. Некалькі гадоў таму патомкі Ляцкага наведалі на нямецкай машыне Орлю. Былі гэта — як расказваў мне Яраслаў Адзіевіч, да якога яны заязджалі — сын дантыста з жонкай-аўстралійкай і ўнучкай. Спадар Яраслаў мяркуе, што Ляцкія трапілі ў Аўстралію мабыць пазней, пасля „белых мядзведзяў" у Расіі.

Дырыжору Акушку давялося папоўніць склад аркестра. На адзінай захаванай Міхалам Шыманскім фатаграфіі з 1933 года відаць, хто тады іграў у ім. Палову музыкаў складалі вучні старэйшых класаў мясцовай школы. У аркестры было семярых яўрэяў: Меер Тафілоўскі, Шэйкін Тапалянскі, Меер Мікляцкі, Вернік, Шмаглер, Грыбіцкі і Бертман. Былі і хрысціяне: м.інш. Уладзіслаў Акушка, Аляксандр Ярымовіч, Міхал Шыманскі, Аляксандр Кубаеўскі.

Калі прыйшлі саветы, тады новы загадчык кафлярні Лейкін (частка Вайштэйнавай сям'і была вывезена ў Сібір) забраў да сябе духавы аркестр, які пасля на працягу двух гадоў іграў па яго загадзе.

Пры немцах, у 1941 годзе, нямецкі камісар Сандэцкі паклікаў усіх пажарнікаў у гміну і загадаў пайсці ў кафлярню, узяць адтуль па адным шынялі, з ліку пакінутых саветамі, неадкладна перафарбаваць іх у фарбавальні і пашыць сабе мундзіры. Такім чынам, як згадваў Аляксандр Кубаеўскі, арлянскія пажарнікі атрымалі аднолькавую форму. Але неўзабаве некаторых хрысціянскіх пажарнікаў адправілі на працу ў розныя бакі, а яўрэяў зачынілі ў арлянскім гета.

Музычныя інструменты аркестра немцы вывезлі ў Кёнігсберг, а яўрэяў панішчылі ў Трэблінцы. Толькі гістарычная ўжо фатаграфія, што асталася ў сям'і Карнеева і дзесяткі гадоў вісіць на сцяне ў саліднай рамцы, нагадвае, што калісь быў у Орлі пажарны духавы аркестр. А ў мяне астаюцца запісаныя на магнітафонную стужку ўсё жывыя ўспаміны апошніх ветэранаў аркестра.

* * *

Калісь у Орлі было скромнае малое драўлянае дэпо (якое месцілася ў вугле сённяшняга парку, насупраць пякарні), а пры ім — сапраўдны духавы аркестр. Цяпер маем у Орлі вялікае мураванае дэпо (значна адрамантаванае ў апошніх гадах), у якім яшчэ пры камуне бурліла культурнае жыццё (часта там ладзіліся забавы, дзейнічаў Гмінны асяродак культуры, а нават арандавала памяшканні ветэрынарная лячэбніца). Зараз, як прызнаўся мне гмінны камендант, глядзельная зала арыентаваная на трызны (у ёй расстаўлены сталы) і няма магчымасці зрабіць там нават нейкую выстаўку. Вось такая цяпер сумная арлянская рэчаіснасць.

На павятовых спартыўна-пажарных спаборніцтвах добраахвотных пажарных дружын Бельскага павета, якія адбыліся 26 жніўня 2007 года ў Вышках, арлянская каманда заняла сёмае — апошняе — месца. Не паявілася там жаночая пажарная каманда з Орлі, пра існаванне якой яшчэ нядаўна не толькі гаварылася.

Абставіны мяняюцца, Радзіма застаецца

Віктар БУРА

Памяць — гэта тое, што трывала звязвае нас з мінулым, нагадвае пра важнейшыя падзеі і факты, робіць чалавека мацнейшым, мудрэйшым, лепшым і забяспечвае нам захаванне ў будучыні. Як эстафета перадаецца яна з пакалення ў пакаленне, звязвае нашу душу. Памяць робіць чалавека бессмяротным. Крыж пры кожнай вёсцы — гэта памяць аб ёй, аб яе жыхарах. Пры ім спынялася пахавальнае шэсце, праводзячы пакойніка ў апошнюю дарогу.

Рудня, Боўтрыкі, Гарбары, Буды, Лука — гэта вёскі, якія апынуліся на дне Семяноўскага вадасховішча. Выхадцы з іх не забываюць узгадваць продкаў, разважаць пра мінуўшчыну і задумвацца над будучым. Традыцыяй ужо стала ладжанне штогадовых дзён памяці па былых вёсках. У чэрвені мерапрыемства ў гонар вёскі **Буды** арганізуюць Раман Ляткоўскі, Анатоль Цімашук, Раман Бура, Ніна і Віктар Лукшы. У ліпені святкаванні ў гонар вёскі **Лука** ладзяць Яраслаў Стоцкі, Вячаслаў Каральчук, Аляксандр Лаўнічук, Пётр Стоцкі, Андрэй Харкевіч, Ян Стоцкі і Анатоль Самоцік. Таксама ў ліпені Марыя Хлябіч (дзявочае Казбярук, па-вулічнаму „Канцавая"), Лявон Хлябіч, Мікалай Хлябіч, Юры Зюзя з Варшавы, Галіна Галёнка і Віктар Бура арганізуюць імпрэзу ў гонар вёскі **Рудня**.

фота архіў „Нівы"

Перад святам арганізатары стараюцца зрабіць нешта карыснае — прыбраць, давесці да парадку наваколле крыжа-помніка. У святочны дзень былыя жыхары вёсак з'язджаюцца на маленькую Радзіму з усіх куткоў краіны і свету, куды закінуў іх лёс. Прыязджаюць яны з дзеткамі, запальваюць свечкі і знічы ў памяць сваіх продкаў. У сваіх прыхадскіх цэрквах заказваюць малебны. Бацюшкі моляцца, царкоўныя хоры спяваюць, рэха царкоўных званоў нясецца далёка, аж да кожнай вёсачкі пад вадою. Пасля прысутныя падаюцца на машынах да крыжоў-помнікаў сваіх вёсак, разам з бацюшкам, зноў моляцца.

Вельмі рупліва, з вялікім душэўным болем клапоціцца за сваю Рудню Марыся Хлябіч. На яе званок з'язджаюцца многія рудняне, якія прысягалі не забываць роднае старонне.

Пасля сумнай сустрэчы ля крыжа-помніка ў Рудні Марыся Хлябіч запрашае ўсіх прысутных у рэстаран „Карына" спадарства Ляткоўскіх на абед. Там за сталом плывуць успаміны аб жывых і пакойных родзічах, пра мінуўшчыну. Ёсць і хвіліна часу задумацца над будучыняй. Руднянскія сустрэчы працягваюцца доўга. Ніхто не спаглядае на гадзіннік, каб хутчэй пакінуць сяброў. Усім хапае часу і тэмаў для размоў. Кожны ўдзельнік сустрэчы адчувае сябе маладзейшым.

На жаль, маюцца і прыклады абыякавага стаўлення да свайго прошлага. Незразумелым для мяне з'яўляюцца адносіны да сваёй малой айчыны былых жыхароў вёскі **Гарбары**. Ані разу на працягу 25 гадоў не сарганізавалі яны спаткання, не заказалі малебна за сваю вёску, ад якой застаўся толькі крыж, не ўшанавалі кавалка зямлі, прасяклай іх потам. Сорамна.

Не могуць пахваліцца добрай памяццю былыя жыхары вялікай і прыгожай вёскі **Боўтрыкі**. У гэтай вёсцы 25 гадоў таму жылі і працавалі вельмі добрыя і шчырыя сяляне. Выйшлі з ёй адукаваныя людзі, якія займалі або займаюць высокія пасады, шматлікія спецыялісты, бізнесмены. На правым беразе Семяноўскага вадасховішча, дзе калісьці аралі зямлю, сеялі збожжа, збіралі ўраджай, рабілі прыгожыя перапёлкі, спявалі жніўныя песні, жыхарам былой вёскі Боўтрыкі была дадзена магчымасць набыць кавалачак сваёй зямлі-бацькаўшчыны, пабудаваць домік, каб потым прыязджаць з горада на адпачынак, успамінаць прошлае сваёй роднай вёскі, суседзяў. Некаторым боўтрыцкім выхадцам гэтае ўдалося зрабіць. Пабудавалі яны прыгожыя дачныя домікі. Боўтрыцкія гараджане ахвотна прыязджаюць сюды падыхаць свежым паветрам, пакарыстацца дарамі грыбнога лесу. На жаль, да сённяшняга дня не знайшоўся сярод іх арганізатар, які заняўся б устанаўленнем крыжа-помніка ў гонар былой вёскі (стары помнік з крыжам нейкі дурман украў). Пішу гэтыя словы з вялікім сумам, успамінаючы колішнюю дружную боўтрыцкую моладзь, якая сустракалася на лавачках і на вечарынах. Жыццё — кароткае імгненне. Давайце паспрабуем у 2008 годзе ўстанавіць па былой вёсцы Боўтрыкі крыж-помнік.

У цяперашні час, калі незалежная прэса ў Беларусі ледзь дыхае, з'яўленне новай газеты дэмакратычнага накірунку само па сабе становіцца падзеяй. Калі ж яшчэ гэтае выданне мае і ўласны сайт у Інтэрнэце, то павага да яго ўзрастае вельмі высока.

Ужо больш за год існуе ў Магілёве газета „Наш Магілёў". Да таго ж яна мае прадстаўніцтва ў сусветным павуцінні, праз якое кожны, хто жадае, можа пазнаёміцца за зместам выдання.

На сайт газеты, што месціцца па адрасе **http://www.nmahileu.org**, мы сёння і зазірнём.

Шчыра кажучы, выяўленне сайта па якасці далёкае ад сайтаў многіх, нават незалежных беларускіх газет, бо не хапае яму нейкага прафесіянальнага падыходу. Але на якасці інфармацыі гэта ніякім чынам не адлюстроўваецца, бо ў сённяшніх напаўпадпольных умовах існавання форма неабавязкова мусіць адпавядаць зместу. Таму пройдземся па сайце, які вельмі падрабязна раскрывае цэлую сутнасць грамадска-палітычнага жыцця трэцяга па велічыні горада Беларусі.

Калі паглядзець на верх выяўлення, то ўбачыць там нейкіх аздабленняў не даводзіцца. Выключэнне складае старажытны герб Магілёва, які распрацоўшчыкі чамусьці не пажадалі размаляваць.

Што ж тычыцца насычэння інфармацыяй галоўнай старонкі, то яна, хоць і не надта структураваная, але адразу прадстаўляе ўвесць спектр праблем абласнога цэнтра, зразумела, з незалежніцкага і дэмакратынага пункту гледжання. У ёй, па ўсім відаць, месцяцца найважнейшыя артыкулы з іншых рубрык сайта. Дарэчы, выйсці на іх знаходзяцца ў крыху нетрадыцыйным месцы — у правым верхнім вугле выяўлення, ідучы двума шэрагамі.

Некаторыя з рубрык пакуль не маюць якой-кольвечы інфармацыі, але тыя, што маюць, прыцягваюць да сябе ўвагу карыстальніка партала. Чаго вартыя, напрыклад, расповеды грамадскіх актывістаў Магілёва аб тым, як яны аказаліся ў апазіцыі. Мне, як чалавеку, які доўгі час удзельнічаў у апазіцыйным жыцці горада на Дняпры, прыемна бачыць новыя твары неабыякавых да сітуацыі ў Беларусі людзей.

Менавіта такія неабыякавыя людзі і стварылі „Наш Магілёў". Каб больш пра іх даведацца, зойдзем на старонку „Пра нас". „На працягу больш чым пяці год (маецца на ўвазе ад 2001 года — У. Л.) інфармацыйнае поле Магілёва было пазбаўлена незалежнай дэмакратычнай прэсы і незалежная інфармацыя да людзей даходзіла толькі праз улётачныя інфармацыйныя акцыі, якія перыядычна праводзіліся дэмакратычнымі сіламі горада, — распавядаюць аб нядаўняй гісторыі супрацоўнікі рэдакцыі. — Зразумела, што колькасць іх павялічвалася перад выбарамі рознага ўзроўню, а пасля гэтага, людзі зноў пачыналі адчуваць інфармацыйны голад. Таму першапачатковай мэтай рэдакцыя газеты „Наш Магілёў" паставіла сабе стварыць перыядычнае незалежнае выданне, якое б жыхары горада маглі атрымоўваць раз на месяц, бо з-за адсутнасці сродкаў у рэдакцыі газета не магла выходзіць часцей. Зараз газета выходзіць з перыядычнасцю два разы на месяц".

Што ж тычыцца электроннай версіі газеты ў фармаце pdf, то ўбачыць можна толькі адзін яе нумар. Будзем спадзявацца, што распрацоўшчыкі сайта, даводзячы яго афармленне да канца, не забудуцца пра стварэнне электроннага архіва „Нашага Магілёва".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Азірнуўшыся на амазонак

Падводзячы спартовыя дасягненні Беларусі ў адыходным 2007 годзе, пачнем з прыгожай паловы краіны.

1. Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) цягам сезона звыкла перамагала ад першага этапу Кубка свету ў Аўстрыі да апошняга ў швейцарскім Люцэрне і ўзяла агульны прыз. Ну а галоўнае — пяты раз у гісторыі (!) стала чэмпіёнкай планеты.

2. Ілона Усовіч (бег) заняла другое месца на дыстанцыі 800 метраў і адзначылася залатым эстафетным спуртам на еўрапершынстве ў залах. А на чэмпіянаце свету на дыстанцыі 400 метраў двойчы здолела палепшыць нацыянальны рэкорд, які належаў яе сястры Святлане.

3. Алена Бунос (більярд) заваявала першае золата сусветнага чэмпіянату ў гісторыі беларускага більярднага спорту. У Кіеве на першынстве планеты па так званай „Свабоднай пірамідзе" яна ўзяла галоўны прыз. А крыху пазней прыбрала да рук у яшчэ нядаўна толькі „мужчынскім" відзе і Кубак Еўропы.

4. Асоль Слівец (фрыстайл) упершыню стала сярэбранай прызёркай першынства свету. Улічваючы тэхнічную складанасць скачкоў на лыжах і ровень канкурэнцыі, гэта сапраўды важкае дасягненне.

5. Надзея Астапчук (штурханне ядра) спярша на турніры памяці трэнера Аўсяніка дасягнула лепшага сусветнага выніку сезона, а потым стала сярэбранай медалісткай чэмпіянату свету.

6. Таццяна Драздоўская (гонкі на яхтах) першынствавала на міжнародным турніры ў Партугаліі — яна вызначылася ў класе „Лазэр-Радыял". А пазней на чэмпіянаце свету, які прайшоў у Партугаліі, здзейсніла феерычную сенсацыю — нечакана для ўсіх выйграла ў гэтым відзе залаты медаль. Гэта стала вышэйшым дасягненнем айчыннага ветразевага спорту.

7. Юлія Бічык і Наталля Гелах (акадэмічнае веславанне). Бронзавыя прызёркі афінскай алімпіяды пасля значнага перапынку зусім нядаўна зноў селі ў адну лодку. І адразу такі феерычны выступ — золата першынства свету!

8. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс). На чэмпіянаце Еўропы выявіла сябе сапраўдным лідэрам каманды (7 перамог у 8 сустрэчах групавога турніру). Разам з расіянкай Святланай Ганінай стала чэмпіёнкай Еўропы ў парным разрадзе, а на адкрытым чэмпіянаце Кітая ў дуэце з Кастраміной заваявала трэцяе месца.

9. Вікторыя Азаранка (тэніс) выйшла ў трэці круг на Australian Open. Таксама дайшла да фіналу турніру серыі СТА, які праходзіў у Ташкенце, потым перамагла Марыю Шарапаву ў розыгрышы Кубка Крамля. Там жа, у пары з Таццянай Пучак, дайшла да фіналу. Але галоўнае — разам з Максімам Мірным перамагла ў міксце на адкрытым чэмпіянаце ЗША. Упершыню ў гісторыі чыста беларуская пара выйграла турнір „Вялікага шлема"!

10. Наталля Цылінская (велатрэк) заняла 3-е месца на чэмпіянаце свету ў гіце, а таксама папоўніла сваю багатую калекцыю на іншых прэстыжных турнірах.

Будзем спадзявацца, што ўсе адзначаныя і тыя, што засталіся „за кадрам" (змясціць у дзесятку лепшых за год усіх вартых не ўдалося) падтрымаюць сваё высокае рэнамэ і ў алімпійскім годзе.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Снежань год канчае

Дзень за днём надыходзіць чарговая зіма. Народная прыказка гаворыць: „Снежань год канчае, зіму начынае”. Паводле народнага календара зіма начынаецца снегам і канчаецца яго зыходам.

Калісьці народ баяўся доўгай, халоднай зімы, а людзі былі вымушаны назіраць за надвор’ем, запісваць яго. За многія гады ў народзе з’явіліся трапныя, цікавыя прыкметы адносна надвор’я.

Назіральнікі надвор’я прыйшлі да высновы, што паміж летам і зімой ёсць простая сувязь. Гаворыцца так:

„Зіма снежная — лета дажджлівае”.

„Цёплая зіма — халоднае лета”.

„Лета ідзе па зіме”.

„Зімою мяцеліцы — летам непагода”.

„Халодная зіма — гарачае лета”.

Іншыя народныя назіральнікі даказвалі, быццам „сем гадоў зіма ідзе па леце, а сем гадоў лета па зіме”. Яшчэ іншыя лічылі, што „тры гады зіма ідзе па леце, тры гады лета па зіме, а тры гады сама па сабе”.

Маецца шмат народных красамоўных прыказак і прымавак адносна надыходу зімы:

„Платон і Раман кажуць зіму нам” (1 снежня).

„Увядзенне налажыла на ваду лядзенне” (4 снежня).

Здаўна людзі прыкмецілі, што не ляжыць снег выпаўшы днём. Лічылі, што зіма прыходзіць ноччу, разам з начнымі марозам і снегам.

Пераважна зіма з’яўляецца ў другой палове снежня разам з Варварай, якая кавалачак ночы „ўварвала”.

Калі 17 снежня сцісне зямлю мароз, то гаварылі так: „Трашчыць Варуха, хавай нос ды вуха”. Ды яшчэ: „Варвара заварыць, Сава (18 снежня) засоліць, Мікола закуе”.

19 снежня „Варвара мосціць, Сава цвікі вострыць, Мікола прыбівае”. „Мікола загвоздзіць, што Ягора (9 снежня) намосціць”.

Цяпер навукоўцы пішуць пра ацяпленне клімату, суровыя зімы нас пакінулі. Невядома якая будзе зіма. Як гаворыцца, пажывём — пабачым.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Мастацкая выстаўка

Ад Нараўкі па Гібралтар

Віктар ШВЕД

Адкрываючы 30 лістапада г.г. у сваёй зале персанальную выстаўку прац вядомага мастака з Гайнаўкі Пятра Гагана, кіраўнік Гарнізоннага клуба ў Беластоку Марэк Ніжынскі сцвердзіў, што жывапісец пастаянна супрацоўнічае з польскім войскам і поўнасцю заслугоўвае чарговай (першая адбылася ў 2004 годзе) экспазіцыі.

Пётр Гаган пачаў маляваць у 1972 годзе і экспанаваная выстаўка падагульвае яго 35-гадовую мастацкую дзейнасць. Першыя яго працы ўзніклі пад кірункам Чэслава Чарнэцкага з Гайнаўкі, які быў яму вялікім аўтарытэтам.

Галоўнай тэматыкай мастацкіх прац Пятра Гагана з’яўляюцца акаляючая нас прырода і яе нязменная прыгажосць; пейзажы маляўнічага Падляшша, асабліва Белавежскай пушчы і даліны Нараўкі. Мастак на сваіх палотнах амаль з імпрэсіяністычнай свежасцю адлюстроўвае празрыстасць колераў, стараючыся адначасова ўлавіць настрой і клімат паднятай тэматыкі, наталіць іх лірычнай паэзіяй.

Мастак-гайнавянін прылічваецца да найбольш таленавітых і прызнаных мастакоў-аматараў Падляшша. Надта актыўны, працавіты, настойлівы ў сваіх творчых пошуках, не накіроўваецца ў бок абстрактнага мастацтва. Але таксама не прытрымліваецца сілком рэалістычнай жывапіснай творчасці.

Пётр Гаган прымаў удзел у пятнаццаці персанальных выстаўках на Падляшшы, у іншых рэгіёнах Польшчы, а таксама за мяжой. Утрымліваючы жывыя кантакты з групамі мастакоў з усяе Польшчы часта з’яўляецца інспіратарам і камісарам пленэраў ды прымае ўдзел у дзесятках калектыўных мастацкіх выставак. Бярэ таксама ўдзел у многіх мастацкіх конкурсах і аглядах ды часта атрымлівае прэстыжныя ўзнагароды.

Пётр Гаган сцвердзіў, што ў апошні час поўнасцю ачаравала яго маляўнічая даліна Нараўкі і прывёз ён на выстаўку ў клуб некалькі краявідаў з гэтай чароўнай даліны. Апрача пейзажаў з Нараўкі і Белавежскай пушчы, мастак прадставіў цікавыя працы са сваёй творчай пабыўкі за мяжой.

Са сваіх падарожжаў у Расію прадставіў ён карціну з выявай славутага Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу, помніка старадаўнасці сусветнага значэння. У сакавіку 2006 года мастак пабываў у Францыі, а дакладней кажучы ў рэгіёне Брэтань, дзе ў горадзе Рэн і пяці іншых гарадах паказваліся яго выстаўкі. Прывёз ён адтуль марскія краявіды, якія ўзбагачаюць экспазіцыю ў клубе. У ліпені 2007 года мастак падарожнічаў у Іспанію — на Гібралтар, адкуль на выстаўку ў Беластоку трапілі таксама марскія краявіды.

Пасля агляду выстаўкі яе наведвальнікамі Пётр Гаган ачараваў яшчэ прысутных сваім дасканалым голасам. У дуэце з вядомым мастаком і адначасова бардам Алегам Кабзаром выканалі яны шмат папулярных беларускіх, рускіх і ўкраінскіх народных песень.

Шчыра заахвочваю чытачоў „Нівы” наведаць цікавую мастацкую выстаўку Пятра Гагана.

Халасцяк я ці жанаты?

Дзядзька ЗАХАР

Ажаніўся я 18 мая 1957 года. Ужо прайшло 50 гадоў з таго моманту. Думаў я сабе, што можа з гэтай нагоды дадуць мне медаль, але гэтак не атрымалася.

Браў я цывільны шлюб у вёсцы Ванева Нарваўскай гміны. Тая хата, у якой змяшчалася гміна і ў якой я запісваўся са сваёй Гануляю, згарэла, разам з дакументамі. Злодзей агонь усё знішчыў. Цяпер невядома, ці я кавалер, ці жанаты. Пасля заключэння шлюбу дастаў я шлюбную метрыку. Здаў я яе ў гмінную ўстанову ў Міхалове, каб ведалі, што я не халасцяк. 12 чэрвеня 1957 года браў я шлюб у царкве ў Новай Волі і там я паказаў метрыку, бо без яе бацюшка не павянчаў бы.

Аднак мая метрыка шлюбу ў Міхалоўскай гміне прапала. Даведаўся я аб гэтым у 1962 годзе, калі мы абое з жонкай выраблялі пашпарты ў павятовай камендатуры міліцыі ў Беластоку. Стаў я тады шукаць метрыку шлюбу, ездзіў у Нарву і ў павятовую Гайнаўку, пісаў скаргі ў партыю. У адказ на скаргу Нарваўская гміна выдала метрыку, на падставе якой вырабілі мы з жонкай пашпарты.

У 1964 годзе нарадзіўся нам сын. І зноў пачалася каніцель. Гміна стала патрабаваць метрыку шлюбу. Я адказаў проста: „Метрыка ў вас, шукайце”.

Цяпер, 50 гадоў па вяселлі, метрыкі надалей няма, няма таксама медаля. Званілі мне з гміны, каб даць ім метрыку, але адкуль мне яе ўзяць. Хіба другі раз трэба браць шлюб у гміне і юбілею чакаць чарговыя 50 гадоў. Трохі даўгавата! Вось якая бюракратыя ў нас.

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	
28	29	30	31	32	33	34	35	36	37	38			

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — арабскую пагаворку.

1. паўднёвае пладовае дрэва блізкае да слівы (*Prunus cerasifera*) = 18 __ 30 __ 22 __ 23 __ 24 __;

2. хто яго пасее той пажне буру = 17 __ 19 __ 11 __ 10 __ 21 __;

3. славянскі бог жывёлагадоўлі, багацця, мастацтва = 28 __ 29 __ 13 __ 12 __ 3 __;

4. без агню не бывае = 35 __ 16 __ 27 __;

5. афрыканская народнасць з паўднёвага ўсходу Нігерыі = 31 __ 15 __ 14 __;

6. яда немаўляці = 6 __ 7 __ 8 __ 5 __ 32 __ 9 __;

7. вяроўка, якой перавязваюць пярэднія ногі жывёлы ў час пасьбы = 20 __ 36 __ 4 __ 2 __;

8. напой з самавара = 1 __ 33 __ 34 __;

9. у мяшку яго не схаваеш = 37 __ 38 __ 25 __ 26 __.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 47 нумара

Ода, руднік, Венгрыя, лоўчы, імпульсатар, Цішка, вадалаз, лістапад.

Рашэнне: **Кроў не вада, разліці шкада.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2008 r. upływa 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 131,00; pocztą lotniczą Europa — 142,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja — 160,00; Australia i Oceania — 204,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 14 000 egz.

Суседскія былі

РАЗУМНЫ ЛЕКАР

Віктар САЗОНАЎ

Ніхто так не раздражняў на гэтым свеце Флёру Бабкевіча як лекары. Цярпець іх не мог больш чым вайны. З той далёкай вайны, папраўдзе кажучы, гэная непрыязь і пайшла. Неяк адарваўся Флёра ад свайго ляснога атрада. Што гэта быў за атрад ні ён, ні хто іншы не ведалі. Хаваліся ад ворагаў па лесе і ўсё тут. А хто тыя ворагі так і не вызначылі. Вырашылі, што непрыяцелі для іх усе, хто ў гэты лес зойдзе без папярэдняй дамоўленасці і заранёў складзенай просьбы ў выглядзе сала, яек і некалькіх літраў пахучай гарэлкі, настоенай на зверабоі, ядлоўцы або бальзаме. Так і жылі. Гэная стратэгія мела як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Добра тое, што атрадам ніхто ніадкуль не камандаваў і байцы самі вырашалі як ім жыць і з кім ваяваць. Але было ў тым і благое — страляілі па іх і немцы, і саветы, і такія ж як яны нявызначаныя атрады, ды нават мірныя жыхары, што ў лес па грыбы хадзілі.

Вось аднойчы, як Флёра збочыў з партызанскай сцежкі, каб справіць у кустах натуральную патрэбу, адзін з такіх мірных грыбнікоў і пальнуў па ім са старэнькага абрэза. Ці то страляць таму не было куды, ці можа палічыў, што як Флёра зняў порткі гэта быў здзек з яго, але патрапіў прама ў мяккае месца ды ўцёк куды падалей, нават „добры дзень" не сказаўшы і не пазнаёміўшыся са сваёй мішэнню асабіста.

Сябры прыляцелі на стрэл, доўга з прастрэленага небаракі рагаталі, а пасля адправілі ў бліжэйшую вёску падлячыцца. Вось тут і пачалася нянавісць Бабкевіча да людзей у белых халатах. Справа ў тым, што той доктар, які лячыў і немцаў, і саветаў, і партызан, і людзей пацыфісцкіх поглядаў, і нават вясковую жывёлу, працёр рану прастрэленага гарэлкай, а выпіць не даў. Для ляснога байца большай абразы не было. Гэта ж трэба, мые гарэлкай азадак, а піць дае выключна горкія лекі.

Колькі ўжо гадоў прайшло з тае пары, а злосць былога партызана толькі ўзмацнялася. А ўсё таму, што кожны наступны лекар, які трапляўся на жыццёвым шляху ветэрана Вялікай Айчыннай, рабіў або тое самае, або яшчэ горшыя рэчы.

— Няма сярод іх разумных, — наракаў стары Флёра ўжо з вопыту пражытых гадоў. — Аднаго дня пайшоў, каб што параілі, бо моцна ў баку балела, дык яны кажуць, што гэта печань уздулася. Гавораць, што гарэлкі ўжываць мне нельга. Смех мне з іх. Нічога не стаў я гаварыць, толькі думаю сабе, якія яны бязмозгія. Мне ж акурат тады і баліць, калі гарэлкі не п'ю. А як перавярну кілішак-другі, то ўсё праходзіць. Той доктар, што летась працаваў у нас, таксама быў дурань. Неяк спытаўся я ў яго, што мне рабіць, бо моцна баліць левая нырка пад раніцу. А ён кажа, што на тое ёсць дзве прычыны. Першая прычына старасць, а другая — гарэлка. Мяне такі смех узяў з яго дурноты. Другая нырка ў мяне таго ж узросту што і першая, але ж не баліць ад старасці. А гарэлку я п'ю горлам, а не ныркамі. Гнаць тых дактароў трэба. Толькі задарма хлеб ядуць.

Як толькі ў вёску прыязджаў новы лекар, Бабкевіч першы ляцеў да яго. Хіба што каб чарговы раз пацвердзіць сваю тэорыю наконт дурноты прадстаўнікоў гэтай прафесіі. Стаяў пад дзвярамі як дубовы слуп, пакуль яго не прымуць. І ўсё дзеля таго, каб пераканацца што і гэты дурань. Нават наперад шчабятаў людзям, што ведае, які дыягназ яму паставіць чарговы медыцынскі свяціла. Вельмі просты дыягназ. І забароніць піць гарэлку.

— Яны сваё няўменне лячыць людзей на гарэлку спісваюць, — тлумачыў Бабкевіч іншым пацыентам. — У іх што ні хвароба, то ад гарэлкі. А як тады растлумачыць тое, што жывёла хварэе? Яна ж гарэлкі не ўжывае. Вось у мяне калісь карова здохла. І не старая была. Ды не піла зусім. Толькі ваду хлябтала. Гатовы пабажыцца хоць перад бацюшкам, што ніколі яе за шклянкай не бачыў. А яна ўзяла ды здохла. Пахварэла крыху, ды адкінулася. Нават дарэзаць не паспеў, бо ў кума свята было і мы тры дні гулялі, пакуль яна хварэла. Дык вось мы пілі і жывыя засталіся. А яна здохла. Разрэзалі, бачым, цвік з'ела, дурніца. Выходзіць, што здохла не ад гарэлкі, а ад кепскай закускі. А каб я цвік праглынуў? Ніхто і разбірацца не стаў бы. Сказалі б, што падох ад гарэлкі.

Неяк прыслалі ў вёску чарговага лекара. Папярэдняму хіба што сумна стала там жыць, а новы яшчэ не ведаў куды патрапіў. Ну і Флёра адразу да яго. Людзі таксама сабраліся ля паліклінікі, каб пасмяяцца з аповедаў Бабкевіча наконт інтэлекту маладога доктара. Гэта за доўгія гады ўжо стала вясковай традыцыяй. Стаяць усе, разявіўшыся ля паліклінікі, ды чакаюць выхаду артыста Флёры. А той заўсёды выскоквае з усмешкай на вуснах ды сцвярджае, што і гэты доктар дэбіл. Маўляў, знайшоў у яго хваробу, якая называецца алкагалізмам. І што ўсе яго праблемы і болі ад таго, што ўчора шмат выпіў. А калгаснікам весела. Рагочуць, цешацца. Не так ужо шмат ёсць чаго ў тым калгасным жыцці, каб можна было пасмяяцца. Вось і ловяць кожны момант.

Але на гэты раз Флёра выйшаў з паліклінікі вельмі сур'ёзны.

— Ну што? — пытаюць у яго вяскоўцы. — Што сказаў гэты дурань? Што піць нельга?

— Хлопцы, гэты лекар неверагодна разумны, — задумліва вымавіў збянтэжаны ненавіснік медыкаў, высока падняўшы палец угару для надання важнасці сказанаму. — Я ўжо і не чакаў сустрэць сярод іх разумнага. Але напаткаў. Гэты ўсіх нас вылечыць. Яму верыць можна. Разбіраецца ў хваробах як цыган у конях. Які разумны! Відаць, вучоны. Не тое што тыя прыдуркі. А гэты дык і распранаць мяне не стаў. Толькі глянуў у вочы і адразу паставіў правільны дыягназ.

— А што там было, — заінтрыгаваліся прысутныя. — Распавядай хутчэй.

— А што распавядаць, — буркнуў усхваляваны Флёра. — Кажу вам, што чалавек разумны. У хваробах разбіраецца. Дарма я грашыў, наракаў на ўсю медыцыну. Думаў, усе да аднаго там бязмозгія. Цяпер мушу павініцца. Не праў я быў. Ёсць і сярод іх спецыялісты. Вось як гэты. Такі разумны, што Божа барані. Не галава, а Дом саветаў. Геній пакуль што нікім не прызнаны. Я першы яго адкрыў. Добра што пайшоў сёння лячыцца. Прыйшоў я да яго і гавару, што галава мне моцна баліць. Але, сцвярджаю, што ён мяне не вылечыць. І з тае прычыны ўсё спіша на гарэлку. Скажа, што каб не балела галава, трэба не піць. А ён глянуў мне ў вочы ды засмяяўся. Ды кажа, што галава мне баліць не ад таго, што я выпіў гарэлкі, а ад таго, што яшчэ сёння не піў. Вось які разумны чалавек! Як ва ўсім разбіраецца добра. Так і параіў мне. Ідзі, кажа, дзед, пахмяліся, і галаўны боль прападзе бясследна. Знікне, як карова языком зліжа.

2008 год

Баран (22.03. — 20.04.) Вельмі прадуктыўны год. Высілкі, упарты ход уперад, рэалізацыя мараў і планаў. Шмат непрадбачаных падзей. Можаш падняцца на новую ступень жыцця. Жыві цяперашняй хвіляй.

Бык (21.04. — 21.05.) Можаш стаць вядомым і папулярным. Зварот да рэлігіі. Уплыў на іншых людзей. Перамогі ва ўсіх сферах дзейнасці. Знакаміты час для навукі. Зразуменне іншых. Захочацца стабільнасці ў пачуццях.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Патрэба дастасавацца да новых умоў. Новыя сустрэчы і знаёмствы прынясуць плён. У першай палове складанасці ў фінансах і асабістым жыцці (у VII-VIII яны могуць пераліцца ў штосьці сур'ёзнае). Восенню перажыванні і любоўнае хваляванне. Магчымыя праблемы з жыллём. Паправа адносін у сям'і.

Рак (23.06. — 23.07.) Лягчэйшая першая палова года (падтрымка спонсараў). Не залезь у даўгі. Абнаўленне бізнесу, перастаноўка кадраў, новы офіс. У другой палове года магчымы немалыя страты звязаныя з сябрамі або складаны збег абставін, непланаваныя расходы.

Леў (24.07. — 23.08.) Выключна плённы год. Кіраўніцтва важнымі праектамі, на працы энтузіязм і задавальненне. Стабілізацыя расходаў і даходаў, затое нестабільнасць у парах. Задбай аб здароўе.

Дзева (24.08. — 23.09.) Год цяжкасцей і абмежаванняў. Заданні з першай паловы года зрэалізуюцца толькі пры высілку і падтрымцы; фінансавая „дыета". У другой палове года клопаты з замежнымі справамі. Рамантычныя знаёмствы. Знакаміты год для нараджання дзяцей. Можаш пазбыцца шкодных звычак.

Шалі (24.09. — 23.10.) Год вялікіх спраў і здзяйснення намечаных планаў. Асвойвай новыя сферы дзейнасці. Час новых пачынанняў і адкрыццяў. Добра ў прафесійнай сферы. Асцярожна з грашыма восенню. У асабістым жыцці перамены. Могуць здаць нервы.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Год перамог і адкрыццяў, выдатна ў фінансавай сферы. Атрымаюцца неспадзяваныя даходы, нават асобам не звязаным з бізнесам. Можаш набыць нерухомасць. У пачуццях не зусім стабільна; не кідай старога кахання! Высыпайся, адпачывай.

Стралец (23.11. — 22.12.) Развіццё новых напрамкаў у справах, ды плён не адразу. Складаныя справы з дакументамі і паперамі. Год удалы для кар'еры, асабліва чыноўнікам. Магчымыя вялікія расходы. Знакаміта на любоўным фронце.

Казярог (23.12. — 20.01.) Поспехі асабліва ва ўласным развіцці і ўдасканальванні. Казка становіцца быллю! Ты на парозе вялікага жыццёвага шанцу! Фантастычныя поспехі, удача ў грашах, прыбыткі. Самотных чакае сустрэча, якая стане даўгавечнай (II, V, VI, IX).

Вадалей (21.01. — 19.02.) Варта адысці ў цень, весці дзейнасць незаўважна. Галоўныя падзеі будуць развівацца ва ўнутраным свеце. Наведвай храмы. Даходы не вельмі стабільныя (у канцы года паправяцца). У другой палове года можа прыйсціся шукаць выхаду з тупіка. Лёсаносная сустрэча магчымая ў II, VI і другой палове VIII.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Новыя інтарэсы і зацікаўленні (асабліва камп'ютэры), новае атачэнне, маса новых планаў і ідэй, затое стабілізацыя ў пачуццях. Вялікая прафесійная актыўнасць, працяг добрых мінулагодніх тэндэнцый. Вельмі добрая першая палова года ў фінансах. Можаш набыць новы дом ці кватэру.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

Архітэктар з Бельска - II

Трасцянка - III

500-гадовы юбілей прыхода ў Харошчы

Размова з Галінай СУРЫНОВІЧ, даследчыцай гісторыі Харошчы.

— Як узнікла Харошча? Якія захаваліся сляды яе паўстання ў дакументах і зямлі?

— Археалагічныя раскопкі праводзіліся ў Харошчы ў 1938 годзе. Былі раскрыты нейкія падваліны, але не ўдалося іх даследаваць з-за выбуху другой сусветнай вайны. Мабыць у тым месцы быў двор Хадкевічаў. Сведчыць пра гэта нават сучасная прасторавая планіроўка Харошчы, дзе вуліца Беластоцкая зараз мае дзіўны выгіб; гэта колішняя хадкевічаўская дарога, якая калісь пралягала проста ад двара ў напрамку Гарадка і Супрасля. Некалькі дзесяткаў гадоў пазней, калі Аляксандр Хадкевіч перадаў манахам усю харашчанскую вотчыну, найважнейшым аб'ектам пасля гэтага стала ў Харошчы царква, якая стаяла ў колішнім цэнтры мястэчка, у рынку. Манахі, якім Іосіф Солтан перадаў тапілецкія ўладанні, хадзілі таксама па дарогах у напрамку Тапільца ці Касцюкоў. Колішні рынак, пасля вызначэння ў XVIII стагоддзі іншага рынка ды пабудовы кляштара і касцёла, паступова забудоўваўся. І сёння маем так, што царква асталася быццам з краю — быццам у цэнтры, і быццам побач цэнтра.

Двор Хадкевічаў быў праўдападобна знесены Браніцкімі, пасля пабудавання апошнімі сваёй летняй рэзідэнцыі ў іншым месцы. І так у XVIII стагоддзі змянілася прасторавая планіроўка горада.

Пачаткі Харошчы, у прынцыпе, невядомыя. Харашчанскі гай быў часткай Бельскай пушчы і падлягаў бельскаму замку, а пасля суражскаму. Сялілі сюды падданчае насельніцтва, якое давала назвы сваім мясцовасцям. У іх ліку былі дрывасекі ці бортнікі, якія выкарыстоўвалі дары лясоў. Яны, мабыць, назвалі рэчку, якая сёння называецца Гараднянкай — ад вытокаў каля Гараднян, — Харашчанкай; і ад яе назву прыняла мясцовасць. Але прафесар Міхал Кандрацюк прыводзіць іншую этымалогію — батанічную, спасылаючыся на пэўны слоўнік лацінска-маларускі, выпушчаны ў Кракаве ў 1936 годзе, які згадвае пра расліну, называемую з украінскай мовы нэхворошчай (*Artemisia*, палын). Мабыць, менавіта, ад буйных зараснікаў гэтага палыну назвалі і мясцовасць Харашчанскім гаем. Яшчэ назву мясцовасці можна выводзіць і ад хворасту.

У 1437 годзе Харашчанскі гай атрымаў тыкацінскі войт Пётр Гумоўскі; запіс гэты вядомы з Мазавецкай метрыкі. Калі гэтыя ўладанні атрымалі Хадкевічы — дакладна невядома, мабыць каля 1460 года. З таго часу пачынаецца асваенне той тэрыторыі. Іван Хадкевіч, будучы на многіх пасадах, мабыць, сам не займаўся насяленнем сваіх зямель, але ад яго імя рабіў гэта ягоны намеснік Юшка. Калі з няволі вярнуўся Аляксандр Хадкевіч разам са сваёй маці, тады ён стаў гаспадарыць у бацькоўскіх уладаннях.

фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Найбольш вядомы акт ад 17 ліпеня 1507 года, які каралеўскім рашэннем харашчанскія ўладанні аддаваў Супрасльскаму манастыру; неафіцыйна гэтая перадача адбылася яшчэ ў 1501 годзе. З дакумента вядома, што Аляксандр перадаў манастыру мястэчка з усім: з падданымі і з іх усімі феадальнымі абавязкамі. Манахі, як мяркуе праф. Антон Мірановіч, узводзяць там царкву, але на гэты конт ёсць сумненні. Насельніцтва, актыўнае ад некалькіх дзесяткаў гадоў, якое завозіла ў мястэчка лесанарыхтоўкі, якія сплаўлялі Супраслю на Нарву, мусіла ўжо стварыць тут буйны гаспадарчы цэнтр і, мабыць, царква была там ужо раней. Пацвярджэннем гэтаму і царква ў Баршчэве, адлеглым два кіламетры ад Харошчы, пра якую нічога не ведаем! Захавалася візітацыя гэтай царквы ў люблінскім архіве з 1725 года. Царква, — напісана там, — накрытая саломай, у любы момант можа паваліцца ад ветру. І, мабыць, яна рухнула, знікаючы не толькі з вачэй вернікаў, але і з памяці іх нашчадкаў. Мабыць, была яна філіяльнай царквой Пакроўскага храма ў Харошчы, якою апекаваліся манахі.

Манахі неслі і рэлігійную паслугу насельніцтву Харошчы і навакольных вёсак. Захаваліся дакументы, якія дазваляюць меркаваць, што большасць з іх трымалася ўсходняга абраду. З манаскага перыяду захаваліся дакументы, бо манахі вельмі скрупулёзна дбалі пра іх. Бо здараліся выпадкі захопу пушчы або карыстання ёю без іх згоды. Гэта патрабавала судовых разбораў у Суражы, для якіх манахі зберагалі ўсе дакументы. З іх можна даведацца пра грамадскасць і пра гаспадарчыя справы Харошчы.

— Ці ў той час, у пачатку XVII стагоддзя, былі ў Харошчы вернікі лацінскага абраду?

— У архівах захоўваецца запіс, што Пётр Гумоўскі перадае касцёлу ў Харошчы дзве карчмы і дзве валокі зямлі з сенажацямі; гэты дакумент датуецца 1459 годам. Пазней ёсць згадка з візітацыі 19 кастрычніка 1804 года, дзе беластоцкі ксёндз-дэкан Лапінкевіч піша, што да дамініканцаў не было ніякай экіпіроўкі харашчанскага касцёла, была толькі капеланія, з капеланам утрымліваным ранейшым двaром; асобнага касцельнага фонду не было. Ды і тыкацінскі войт не быў на той час настолькі магутным уладаром, каб каланізаваць Харашчанскі гай; зрабілі гэта Хадкевічы. І невядома, ці людзі Гумоўскага не пакінулі Харашчанскага гаю запар з адыходам ранейшага іх уладара.

У XVI стагоддзі сталі ўзнікаць кругом Харошчы вёскі з праваслаўнымі пасяленцамі. Хронікі паведамляюць, што ў 1533 годзе былі ўжо Нярэмкі — сённяшнія Яронікі, Саннікі, Жоўткі, Дзікія, Алішкі, Сянкевічы, Баршчэва, якое атрымала назву ад недалёкага балота Боршчы. Зварот „нашы людзі" абазначаў, што пасяленцы паходзілі з ранейшых уладанняў Хадкевічаў. Харашчанскія ўладанні Аляксандр Хадкевіч узбуйніў новымі набыткамі, купляючы маёнтак Рагова, які таксама насяляў сваімі мужыкамі, якія засялілі вёску Рагова, далучаную да Харашчанскага прыхода. Аднак найбольшае згуртаванне праваслаўнага насельніцтва знаходзілася ў адлеглай за два кіламетры ад Харошчы вёсцы Рушчаны, якой назва падказвае іх рускае паходжанне. Мабыць, у 1533 годзе з Рушчан і Жоўткаў была назначана дзесяціна, пра якую згадваюць пазнейшыя крыніцы. Пазнейшыя метрыкальныя кнігі паказваюць, што праваслаўныя вернікі пражывалі ва ўсіх вёсках кругом Харошчы.

— Праваслаўны прыход у Харошчы быў заснаваны ў 1507 годзе. А калі быў узведзены прыхадскі храм?

— Дакладна невядома. Ёсць дакументы Хадкевічаў з 1510 года, у якіх мова пра храм усходняга абраду. Пасля 1533 года двор у Харошчы разам з уладаннямі вяртаецца да Хадкевічаў і, мабыць, тады філіяльная царква становіцца самастойнай, прыхадской. У 1559 годзе ў Харошчы вянчаецца князь Раман Сангушка з дачкой Рыгора Хадкевіча Аляксандрай. Думаю, што штуршок росту Харошчы ў XVI стагоддзі далі менавіта Хадкевічы, бо ў 1590-х гадах налічвае яна ўжо каля 1 200 жыхароў.

Пасля смерці Рыгода Хадкевіча ўладальніцай Харошчы становіцца ягоная дачка Ганна, жонка кіеўскага ваяводы Паўла Сапегі. Пасля ягонай смерці ў 1580 годзе, мяркую, Харошча становіцца ўласнасцю Яна Пятра Сапегі, ужо каталіка, але выхаванага ў праваслаўі. Быў ён постацю гарэзлівай, быў палкоўнікам, удзельнічаў у маскоўскіх дзімітрыядах, памёр у 1611 годзе на Крамлі. Той 1611 год быў

працяг ☞ II

9 770546 196000

І ☞працяг знамянальным, калі ў сілу прынцыпу cuius regio, eius religio, спадкаемцамі становяцца Пацы. Ян Пётр, які быў спадкаемцам Ганны, вельмі задоўжыўся, усе ягоныя маёмасці былі аддадзены ў залог за даўгі; мабыць і Харошчу заснаваў за доўг у Пацаў. І, мяркую, што пераход Харошчы ва уніяцтва наступіў каля 1611 года, калі стала яна ўладаннем Пацаў. Маем дакумент, які сцвярджае, што ў 1641 годзе была пабудавана Аннай Марцыбэлай Пацавай новая царква і быў адноўлены яе зямельны фонд вартасцю ў паўтары валокі ў вёсцы Рушчаны.

Мяняецца выгляд гарадка. У 1611 годзе будуецца тут драўляны каталіцкі касцёл, які атрымлівае дзесяціну з уладанняў Яна Пятра ў Харошчы, Рагове і Рагоўку. У 1654 годзе чарговы ўласнік Харошчы, ваявода трокскі і будучы віленскі біскуп Стафан Мікалай Пац запрашае ў Харошчу ордэн дамініканцаў і ўзводзіць ім драўляны кляштар і мураваны касцёл. Быў гэта кляштар для дванаццаці айцоў дамініканцаў, якія атрымалі багатае фінансавае забеспячэнне, атрымаўшы тры вёскі: Яронікі, Агароднікі і Сянкевічы. Жыхарамі тых вёсак, як паказваюць захаваныя прозвішчы і імёны, былі праваслаўныя мужыкі.

— ***З таго часу, з 1611 года, Харошча з наваколлем прымае уніяцтва. Што было там далей?***

— Адбываецца паступовая лацінізацыя. Дамініканцы бралі ў сваю апеку ўсіх; калі каму здарыўся пажар, яны прымалі пагарэльцаў у свае келлі. У 1703 годзе Харошча пераходзіць у рукі Браніцкіх. У той час гарадок знішчаюць два вялікія пажары; невядома, як пацярпела царква, але касцёл з кляштарам згарэлі, згарэла шмат іншых збудаванняў. Браніцкі пасля гэтага вырашыў пабудаваць у Харошчы летнюю рэзідэнцыю, у зусім іншым месцы чым ранейшы цэнтр. Але ў другой палове XVIII стагоддзя рашыў ён таксама змяніць выгляд мястэчка, каб было яно годнай аправай ягоных харомаў. І ў выніку царква апынулася на абочыне. Захаваліся візітацыі і апісанні царквы з таго перыяду. Царква ў той час праходзіла рамонт.

Я хачу падкрэсліць адзін момант. Многія гавораць, што Харошчу будавалі Браніцкія, узводзячы тут, і ў Беластоку ды Тыкоціне, прыгожыя будынкі. Але не заўважаем таго, што ўзводзілі тыя пабудовы іх падданыя, найбольш мужыкі ўсходняга абраду. Захавалася карэспандэнцыя, дзе Юзаф Санкоўскі пісаў Браніцкаму, што трэба спыняць работы на час „рускіх" святаў.

Захаваліся візітацыі падляшскага дэкана Гуторскага, якія апісваюць харашчанскую царкву і яе парохаў. З гэтых апісанняў вынікае, што стан царквы ішоў на спад. У другой палове XVIII стагоддзя царква штораз больш пападала ў руіну. У 1788 годзе Гуторскі піша: „Od dwóch niedziel i mszy w niedzielę pierwszą nie było i nigdy dotąd pomieniony ks. Leon [Pawłowski] cerkwi i parochii nie pilnował ustawicznie absentując się, po różnych kościołach bez wiedzy i zwierzchności swojej i dlatego Marianna Jarosławska, parochianka, że nie miała księdza do siebie chorej prosiła ks. Dominikana i obrządek odmieniła. W cerkwi wielki znalazłem nieporządek, bo msza rzadko kiedy bywa, a do tego okna powybijane, czyli przez ks. wybrane do plebanii jak jest informacje świadka. Tamże sowy zastałem, gdzie ołtarze tak szkaradne i spaskudzone znalazłem, iż wyrazić trudno. (...) Parafia nie wie, kiedy święto ruskie i posty. Sam ks. Leon zawsze po rzymsku lubi i dlatego miejsca nie pilnuje. Wszędzie w rzymskich ornatach mszę odprawuje". Дэкан загадваў пароху хадайнічаць у кцітаркі Ізабэлы Браніцкай за сродкамі на рамонт царквы, але безвынікова. У той час парафія налічвала 288 вернікаў. Чарговая візітацыя, з 1804 года, паведамляе пра іншых ужо парохаў. Царква надалей руйнавалася, а ў 1800 годзе было пры ёй ужо 162 вернікі, а ў 1804 годзе толькі сто душ здольных спавядацца. А пасля метрыкальныя кнігі абрываюцца і невядома нічога пра харашчанскую царкву аж да 1840 года.

— ***Як прайшло ў Харошчы скасаванне царкоўнай уніі?***

— Пра гэта не захаваліся ніякія звесткі. У запісках Сямашкі ўдалося мне знайсці згадку, што ў час рэфармавання уніяцкай царквы, у Харошчы ў 1836 годзе быў пастаўлены новы іканастас.

— ***Яго раней не было, як у лацінскім храме?***

— Вядома, не было. У той жа час паўстае ў Харошчы вялікая тэкстыльная фабрыка, на працу ў якой прыязджае шмат немцаў і ў палове XIX стагоддзя ў Харошчы паяўляецца чацвёрты храм: да касцёла, царквы і сінагогі далучаецца пратэстанцкая кірха. У 1853 годзе настаяцелем прыхода ў Харошчы становіцца Антон Макавельскі, які пачынае хадайніцтва за пабудовай новай царквы, якое доўжылася звыш дваццаці гадоў. Пасля студзеньскага паўстання, у 1865 годзе праваслаўнаму прыходу быў перададзены кляштар дамініканцаў. Адкрыта ў ім народнае вучылішча, выдзелена там жа восем кватэр работнікам мясцовай фабрыкі ды кватэры праваслаўным настаяцелю і псаломшчыку. Кляштар патрабаваў пастаянных рамонтаў.

Старую царкву з усіх бакоў акружалі жыдоўскія пабудовы. Гэтае суседства было вельмі дакучлівае з-за таго, што там былі хлявы з жывёлай, ад якой разносіўся цяжкі смурод. Да таго ж у нядзелі і святы жыды працавалі і гэты гоман вельмі перашкаджаў малітвам у царкве. Хадайніцтвам настаяцеляў за пабудовай прыстойнага храма паспрыяў магутны пажар з красавіка 1880 года, калі згарэла трэць мястэчка, у тым ліку і яўрэйскае атачэнне царквы; сама царква не згарэла, ніхто не загінуў. Новую, мураваную ўжо, царкву ў Харошчы завяршылі будаваць у 1883 годзе на ранейшым царкоўным пагосце.

— ***У пачатку XIX стагоддзя лік вернікаў усходняга абраду ў Харошчы ўпаў да сотні. Што было далей з прыхадской дэмаграфіяй?***

— Раслі вёскі, гэта быў агульны трэнд. І рос лік вернікаў харашчанскага прыхода. У 1852-1855 гадах быў вельмі рэзкі спад гэтага ліку, на амаль дзве сотні, але ён ахапіў таксама іншыя мясцовасці, у тым ліку і Беласток. Высветлілася, што ў той час прайшла тут хваля неўраджаю, быў голад. Пасля лік насельніцтва стаў зноў узрастаць. Да першай сусветнай вайны Харошча налічвала каля пяці тысяч жыхароў, пятую часць іх складалі праваслаўныя 1 060 вернікаў. У 1920 годзе прыход налічваў 325 асоб, а два гады пазней ужо 697 вернікаў; апошні лік утрымаўся да выбуху другой сусветнай вайны. З Рушчан, па сутнасці, у бежанства выехалі ўсе жыхары, а вёска была спалена. У 1919 годзе дзейнічала толькі царква ў Тапільцы, якая ахоплівала сваёй апекай праваслаўныя прыходы ў Харошчы і Фастах. У 1921 годзе рашэннем варшаўскага міністэрства веравызнанняў гэтыя тры парафіі падпарадкаваны былі сабору ў Беластоку, а ў 1924 годзе быў адноўлены прыход у Харошчы з філіяй у Тапільцы з дазволам правіць службы ў гэтых цэрквах у розны час. А царква ў Фастах мела стаць уніяцкай; і стала ў 1928 годзе.

— ***Як на лік вернікаў паўплываў 1905 год, калі былі знесены рэлігійныя абмежаванні ў адносінах да каталікоў?***

— Нічога пра гэта невядома, не захаваліся звесткі, на аснове якіх можна было б пра гэта меркаваць.

— ***А як паўплывала другая сусветная вайна?***

— Да яе было ў Харошчы каля сяміста вернікаў. У 1944 годзе гэты лік упаў да 550, а ў 1949 годзе — да двухсот дваццаці. У выніку тэрору — запалохвання і забойстваў — частка праваслаўных вернікаў выехала з Харошчы за ўсходнюю мяжу Польшчы, іншая частка — на заходнія землі. Зараз у Харашчанскім прыходзе каля двухсот вернікаў.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Родам з Беласточчыны

ЛЕТУЦЕННЫ ХЛОПЕЦ З БЕЛЬСКА

Сяргей ЧЫГРЫН

Калі Янка Купала ўбачыў макеты трох прапанаваных архітэктарам Іосіфам Лангбардам будучых будынкаў у Мінску — Дома ўрада, тэатра оперы і балета, а таксама дома Чырвонай Арміі (цяпер Дом афіцэраў), ён аж ускрыкнуў: „А летуценны хлопец, гэты Лангбард!..".

Архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, прафесар Акадэміі мастацтваў СССР, адзін са стваральнікаў Саюза архітэктараў СССР Іосіф Лангбард (1882-1951) сапраўды быў летуценнікам і вельмі таленавітым чалавекам. Ён быў аднагодкам Янкі Купалы і Якуба Коласа. Яны часта сустракаліся, вялі гутарку пра Мінск, пра нашу культуру і архітэктуру.

Іосіф Лангбард нарадзіўся ў Бельску-Падляшскім 6 студзеня 1882 года. Іх дом знаходзіўся недалёка ад рэчкі Белай, дзе хлопчык любіў са сваімі равеснікамі купацца і лавіць рыбу. Бацька вельмі хацеў, каб сын атрымаў адукацыю і пачаў займацца камерцыяй. Але Іосіф з маленства любіў маляваць. І маляваў усё, што бачыў. Маляваў усім, што трапляла пад руку, і на чым толькі можна было маляваць. Ён быў здольны не толькі да малявання, але і да вучобы. Пасля заканчэння мясцовай гімназіі, 19-гадовы юнак пакідае родны горад і едзе вучыцца ў Адэскае мастацкае вучылішча. У 1907 годзе ён вытрымлівае конкурсныя экзамены і паступае на архітэктурнае аддзяленне Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, пасля якой яму прысвойваецца званне архітэктара-мастака.

Самымі творчымі і плённымі для Іосіфа Лангбарда былі 30-я гады XX стагоддзя. Па даручэнню Саўнаркама БССР ён кіруе праектаваннем і будаўніцтвам першай Усебеларускай сельскагаспадарчай і прамысловай выставы ў Мінску. Тэрыторыя была даволі вялікая — ажно 75 гектараў. У кароткі тэрмін на ўскраіне сталіцы было ўзведзена больш за 40 павільёнаў. Амаль усе яны былі выкананы з дрэва і, вядома, да сённяшніх дзён не зберагліся. Выстава тады праходзіла з 10 жніўня да 1 лістапада 1930 года.

Поспех нашага земляка не застаўся незаўважаным. Ён прымае самы актыўны ўдзел у распрацоўцы праекта забудовы цэнтра Мінска. У 1930-1934 гадах па праекце Іосіфа Лангбарда ў Мінску ўзводзіцца будынак Дома ўрада Беларусі. Гэта буйнейшае грамадскае збудаванне ў рэспубліцы, аб'ём якога 240 тысяч кубічных метраў. У ім у даваенны час знаходзіліся амаль усе дзяржаўныя органы, якія былі ў той час у Мінску. Дом урада і сёння лічыцца адным з лепшых прыкладаў савецкай архітэктурнай школы.

У 1930-я гады па праектах Іосіфа Лангбарда ў Мінску ўзводзіцца яшчэ некалькі будынкаў. Арганічна ўваходзіць у забудову цэнтра беларускай сталіцы Дом афіцэраў (1934-1939), будынак Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (1934-1938). У 1935 годзе нашаму земляку даручаюць праектаванне Акадэміі навук Беларусі. Будаўніцтва комплексу пачалося па праекце архітэктара Георгія Лаўрова, аднак гэты праект хутка быў адхілены. Іосіф Лангбард захоўвае першапачатковую планіроўку карпусоў і распрацоўвае толькі галоўны фасад. У 1939 годзе будаўніцтва Акадэміі навук было завершана і беларускіх вучоных павіншавалі з наваселлем.

У гэты ж час Іосіф Лангбард прымае ўдзел у стварэнні грамадска-палітычнага цэнтра ў Магілёве: па яго праекце ў абласным горадзе

Погляд з Беларусі

На заходніх беларускіх крэсах

Лявон КАРПОВІЧ

Усе народы, усе дзяржавы маюць свае крэсы. Нешчаслівы і зменлівы ёсць лёс гарадоў і сёл на крэсах. Калі віхар зрываецца, устрасае перад усім пасады іх будынкаў. Калі збіраюцца хмары, востры град сячэ перад усім зямель крэсавых нівы. Калі грымяць перуны, перад усім тут у вежы і дамы ўдараюць...

Юзаф Пілсудскі

Культура крэсаў, ідэалогія крэсавая, сітуацыя зямель на крэсах... Хіба што гэтыя пытанні не хвалююць беларускага грамадства ні на афіцыйным, ні на неафіцыйным узроўнях. У некаторай ступені гэта зразумела. Мы на сваёй зямлі не можам вызначыцца хто ў нас герой, а хто здраднік і што ў жыцці важнейшае — каўбаса ці культура, ды нават адкуль мы — ад малпы ці ад Бога... Але калі сутыкаешся непасрэдна з жыццём на крэсах, узнікае нейкае своеасаблівае пачуццё гонару і адначасова сораму і віны...

Не стаўлю перад сабой мэту раскрыць тэму крэсавай палітыкі, яе ролі і значэння. Проста запрашаю папрысутнічаць разам са мной сярод людзей вёскі Трасцянка, што ў Беластоцкім ваяводстве, палюбавацца прыгажосцю прыроды сярод лясоў і балот на беразе ракі Нарвы.

Летам 2007 г. патэлефанаваў мне сябра і запытаў, ці не хачу я зарабіць трохі грошай. Грошай замнога не бывае, тым болей што я займаюся філатэліяй і люблю купляць кніжкі, а з настаўніцкай пенсіі ў 350 тысяч беларускіх рублёў ні на якое хобі разлічваць не прыходзіцца. Таму я зацікаўлена запытаўся, якім чынам можна гэтыя „трохі грошай" зарабіць. Аказалася, што трэба касіць балота недзе ў Беластоцкім ваяводстве. Заробак 750 долараў за месяц плюс жыллё і харчы. І, хоць я ніколі ў жыцці не касіў балота тракторнай касілкай, прапанова мяне зацікавіла. А калі жонка, пачуўшы такую перспектыву, рашуча сказала: „Едзь! Можа заробіш хоць на маркі", дарогі назад не было. Стэлефанаваўшыся са сваім працадаўцам, 3 жніўня я сустрэўся з ім на рагу вуліцы Ліпавай у Беластоку (блага, што віза ў мяне была, як і дазвол на выезд ва ўсе краіны свету).

Як адбываецца падарожжа з чыгуначнага вакзала Гродна цягнікам Гродна — Кузніца — асобная тэма не толькі для журналіста, рэпарцёра ці пісьменніка, але і для сацыялагічнага даследавання і многіх, нават, філасофскіх высноў.

Фота Міры ЛУКШЫ

Царква ў Трасцянцы

Яшчэ праз паўгадзіны язды легкавым аўто гаспадара я апынуўся на месцы свайго новага жыхарства ў вёсцы Трасцянка па дарозе з Беластока ў Нарву і Гайнаўку. Вясковы дом для майго пражывання быў у палове свайго новага статусу. Нанова ашаляваны і пакрыты бляхай (металачарапіцай) з дабудаванай вялікай верандай і без печаў. Чаму ў палове? Бо акрамя замененых аконных рамаў і падлогі ў памяшканнях дома больш нічога не было зроблена. Каб праз шчыліны ў столі не сыпалася смецце, яна была падшыта плёнкай. Адзіны без зліву кран з халоднай вадой. Без ацяплення, затое з камінам, які ў будучым мяне вельмі выручаў. Халадзільнік, настольная газавая пліта з балонам, адзінокая лямпачка пад столлю, ложак, некалькі крэслаў, старых, але ўтульных, журнальны столік, трохі посуду, трохі старой мэблі каля сцен з некалькімі кніжкамі на польскай і рускай мовах... Большасць памяшканняў занята будаўнічай ватай, фарбай, інструментам... Усё ўперамешку. Прыбіральня з дошак за разваленым хлявом і стары сад з яблынямі і грушамі. Як я потым рассмакаваў, грушы былі не вельмі добрымі на смак, а яблыкі — цэлы жнівень падалі з дрэва цудоўныя папяроўкі, а ў верасні, невядомай мне назвы, але не менш смачныя. Яблык мне было ўвесь час уволю, бо гаспадарам яны зусім непатрэбныя. Падаюць і гніюць.

Не першы раз, папаўшы ў Польшчу, я не чакаў занадта новых уражанняў. І, да вялікага задавальнення, я вельмі памыліўся. Першай нечаканасцю было тое, што жыхары Трасцянкі віталіся паміж сабой і са мною, гаворачы „Добры дзень", а не „Здрасця", як у маім Лунне, і не „Dzień dobry". Аказалася, што большасць жыхароў вёскі наогул размаўляюць па-беларуску. Я як бы вярнуўся ў сваё дзяцінства ў вёску Цярэшкі, што ў 20 км ад Ваўкавыска. Там таксама ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі размаўлялі па-беларуску. Але паступова ўсё зышло на трасянку ў тых, хто застаўся жыць у вёсцы, і на расійскі дыялект у тых, хто з'ехаў у горад. Тут жа гучыць паўсюдна беларуская мова, праўда, гучанне крыху іншае, чым на Гродзеншчыне. Так мой працадаўца на папрокі маці навошта яму гэтае балота і гэты лес, якія вымагаюць столькі працы, адказваў: „Мамо, то ні я лес купыў, то лес мінэ купыў".

Каб зразумець, чаму ў Польшчы цэлая вёска (як я ведаю цяпер, і не адна) размаўляе на беларускай мове, вымушаны быў я пацікавіцца гісторыяй гэтай вёскі. Тут мне пашанцавала. Ураджэнцам вёскі Трасцянка з'яўляецца Віктар Стахвюк. Страшэнна энергічны, працавіты і таленавіты чалавек. Мастак, пісьменнік, бізнесовец, патрыёт сваёй вёскі і навакольнай прыроды. Захапляецца ён падводным фатаграфаваннем. Усяго не пералічыць. Ён падарыў мне кніжачку сваіх вершаў „Багровы цень" і кніжачку прозы „Siva zozula". З іх мае веды аб гісторыі Трасцянкі і знаёмства з арыгінальнымі ідэямі спадара Віктара.

Sioło Tryscianka — так піша Віктар Стахвюк — існуе не менш 4 тысяч гадоў. Спачатку існавалі тры „кучувы забудовы", а ў 1537 г. пасля ўвядзення на землях Аляксандра Хадкевіча „валочнай" рэформы, тры кучы пераўтварыліся ў тры „szerechuwki": Гора, Скорышэво, Кутэры — адгэтуль назва Трысцянка, ад трох хутароў, трох „сцен". працяг ☞ IV

будуецца Дом Саветаў. Адначасова ў Ленінградзе ён праектуе і па яго праекце будуюцца жылыя дамы і стадыён, будынак абкама кампартыі Украіны ў Кіеве, устанаўліваюцца помнікі Васілю Чапаеву ў Куйбышаве, Тарасу Шаўчэнку ў Харкаве, Зоі Касмадзям'янскай у Тамбове.

У гады Другой сусветнай вайны гаспадарамі Мінска былі немцы. А архітэктар быў эвакуіраваны ў Расію. У Доме ўрада знаходзіліся нямецкі штаб, гестапа і база забеспячэння нямецкіх войскаў. У тэатры оперы і балета немцы зрабілі стайню, а ў Германію вывезлі старую мэблю, люстры, дываны, карціны мастакоў, каштоўны тэатральны рэквізіт. А Дом афіцэраў для немцаў стаў салдацкім клубам. Акупацыйныя часці знаходзіліся падчас вайны таксама і ў Акадэміі навук. Але будынкі не пацярпелі. Тым не менш, пасля вайны ў кастрычніку 1944 года група архітэктараў разам з Іосіфам Лангбардам склала сваю ідэю адраджэння і планіроўкі Мінска. На працягу пяці гадоў наш зямляк з'яўляўся кіраўніком майстэрні „Белдзяржпраект", быў адным з аўтараў генеральнага плана аднаўлення Гомеля ў сярэдзіне 40-х гадоў. Але пасля вайны таленавітаму архітэктару так і не ўдалося стварыць у Мінску ніводнага манументальнага будынка. Лангбард быў пад пільным наглядам НКВД, яго пачыналі абвінавачваць у тым, што ён імітуе Захаду, вучыцца ў заходніх архітэктараў і г.д. Але па сваіх прафесійных поглядах Іосіф Лангбард быў прыхільнікам крытычнага асваення і выкарыстання традыцый мінулага. У класіцы ён цаніў архітэктурную дысцыпліну і парадак, суразмернасць асноўных формаў. Архітэктар імкнуўся развіваць адну з традыцый беларускай нацыянальнай архітэктуры — яснасць і прастату кампазіцыйнага рашэння, лаканізм і стрыманасць у прымяненні дэкаратыўнага ўпрыгожання. Будынкі, пабудаваныя па праектах І. Лангбарда, і яго конкурсныя працы адрозніваюцца выразнасцю і, можна сказаць, нейкай дзелавітасцю. Дойлід напісаў яркую, поўную самабытнасці старонку ў гісторыі станаўлення і развіцця архітэктуры Беларусі ў першай палове XX стагоддзя. Даволі значная яго заслуга і ў фармаванні творчага калектыву архітэктараў Беларусі. Вялікую ролю ў гэтым адыграла яго непасрэдная дапамога і асабісты прыклад. У сваёй творчай дзейнасці Іосіф Лангбард стварыў больш за 100 праектаў будынкаў рознага прызначэння, манументальных пабудоў, а таксама архітэктурных фантазій. Шмат разоў ён станавіўся пераможцам і лаўрэатам розных конкурсаў. 15 праектаў дойліда былі ўвасоблены ў жыццё, з іх 8 — у Беларусі. Яны і сёння з'яўляюцца прыкладам творчага пошуку і ўпрыгожаннем гарадскога пейзажу. Хаця яго сябрук скульптар Заір Азгур у сваёй кнізе ўспамінаў „Тое, што памятаецца" (Мінск 1984, кніга 2, с. 51) пісаў, што „шмат пабачыўшы ў сваім жыцці Іосіф Лангбард, магчыма вельмі шкадаваў, што не паспеў зрабіць нечага вельмі важнага".

Славуты архітэктар магчыма і не паспеў зрабіць нечага важнага, але ён вельмі любіў Беларусь, беларускія гарады і мястэчкі, любіў беларускі народ. Хаця пасля вайны яму жылося не вельмі лёгка і спакойна. Ён жыў у Ленінградзе, нават выкладаў у Акадэміі мастацтваў, быў прафесарам, доктарам архітэктуры. Але яго вельмі цягнула на Беларусь, дадому, да сваіх землякоў, дзе адчуваў ён сябе лепш, спакайней, вальней. Ды вольнасці ў канцы 1940-х — пачатку 1950-х гадоў на Бацькаўшчыне было вельмі мала. А 3 студзеня 1951 года нашага земляка не стала. Ён памёр у Ленінградзе (цяпер Санкт-Пецярбург). Пасля смерці архітэктара, яго жонка Вольга Лангбард перадала архіў мужа мастаку Сымону Гельбергу, які ў сваю чаргу перадаў яго кафедры архітэктуры Беларускай політэхнічнай акадэміі.

Сёлета ў студзені споўнілася 125 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Лангбарда. На вялікі жаль, памяць пра яго ў Мінску, Магілёве і ў Гомелі не ўшаноўваецца, а тым больш у самой Беларусі. Хіба ён сам сябе ўшанаваў — пакінуў для нашчадкаў у Мінску будынкі Дома ўрада, тэатра оперы і балета, Нацыянальнай Акадэміі, Дома афіцэраў і іншыя. Ды і на былых беларускіх грашовых купюрах наміналам 1 рубель і 1 000 рублёў, і на цяперашняй 100-рублёвай купюры, як сведкі пра талент дойліда, адлюстраваны Акадэмія навук і тэатр оперы і балета. А вось сёлета ў Санкт-Пецярбургу да юбілею майстра была арганізавана выстава ў Петрапаўлаўскай крэпасці. На выставе экспанаваліся больш за 70 лістоў архітэктурнай графікі Лангбарда з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга, асабістыя дакументы і фотаздымкі.

III ☞працяг Першае пісьмовае ўпамінанне з 1496 г., калі быў заснаваны з надзелу бельскага старасты Гаштольда двор „путнага баяра". Двор служыў таксама як каралеўская станцыя па дарозе з Кракава ў Вільню. Царква ў Трасцянцы існавала ўжо ў 1541 г. Звестак пра яе пабудову і гібель няма. Новую „царкву грэцкую рытуалаў і цырымоній рускіх ці славяньскіх" фундавала Кацярына Аляксандра Браніцкая ў 1673 г., надзяліўшы 2 валокамі (43 га) зямлі. Царква згарэла ў 1866 г. Сучасная драўляная царква св. Міхаіла Арханёла знаходзіцца на ўзгорку бліжэй да заходняга канца вёскі. На набажэнства сюды збіраецца чалавек 30-40 народу, пераважна сярэдняга і старэйшага ўзросту. Яны і складаюць насельніцтва вёскі, якая паступова пераўтвараецца ў „спальны раён" Беластока. Так, калі суседзі з усходу ад майго часовага жылля стала жывуць у Трасцянцы, то суседзі з захаду прыязджаюць у свабодны час, каб выкасіць траву. Дзеці гуляюць на траўніку і гойдаюцца на шугаўках, гаспадар працуе над інтэр'ерам дому, гаспадыня чаруе над вогнішчам, рыхтуючы ежу на свежым паветры. Так цераз адзін дом усё паўтараецца. Зайшоўшы ў царкву, я звярнуў увагу, што ў куточку, дзе прадаюцца свечкі, іконкі і іншыя царкоўныя тавары, ёсць паштоўкі з відарысам трасцянскай царквы. На маё пытанне аб кошце, атрымаў адказ, што паштоўка каштуе 1 злот, але з-за таго, што ўжо даўно іх ніхто не купляў, я магу ўзяць яе дарма.

Ад царквы на ўсход па левым баку вуліцы 60 дамоў, па правым — 48. Палова з іх пакрыта бляхай (металачарапіцай), астатнія, за выключэннем 4 ці 5 пакрытых шыферам, ганчарнай чарапіцай. Дамы і сядзібы маюць прыгожы акуратна дагледжаны выгляд. Розняцца ў залежнасці ад дастатку і густу гаспадароў. „Спальныя дамы" шыкоўныя, ашаляваныя прыгожай драўлянай шалёўкай, з газонамі і без агародаў. Дамы жывучых тут пенсіянераў скрамнейшыя з простымі платамі, за агароджай можна ўбачыць градкі з агароднінай. Усе двары аж да дарогі выстрыжаны газонакасілкамі. Толькі маці майго гаспадара вырэзвае траву ў падворку сярпом, бо пасуседску з ёю жывуць дзве няпоўнаспраўныя дзяўчынкі, з якімі яна сябруе і кожны дзень нарэзвае свежай травы трусам, якіх даглядаюць дзяўчынкі. Па паўночнай старане вуліцы цягнецца рад электрычных слупоў так, што насупраць кожнага дома вечарам запальваецца ліхтар. За два месяцы я не ўбачыў, каб хоць адзін ліхтар не гарэў. На кожным 5-6 слупе электрыкі замацавалі колы для буслоў. Не раз можна было назіраць, як з праязджаючых самаходаў выходзілі людзі, каб сфатаграфаваць буслоў на слупах. Паміж слупамі праз метраў 50 размешчаны гідранты-краны на выпадак пажару.

Прысядзібныя ўчасткі на заплечы дамоў апрацоўваюцца праз адзін. Я налічыў 5 участкаў засаджаных лесам: бярозкамі, ялінкамі, дубкамі. Мне казалі, што гаспадарам, хто гэта зрабіў, дзяржава выплачвае якіясьці грошы. У вёсцы два аўтобусныя прыпынкі з будкамі збітымі з дошак, дзе можна прысесці і схавацца ад непагоды. З Трасцянкі можна заехаць у Беласток, ці Нарву, ці Гайнаўку аж 16 разоў за дзень, пачынаючы з 5^{42} раніцы і да 18^{50} вечара. Кошт білета да Беластока 5,5 злота (прыблізна 4 800 рублёў), 38,8 км і гадзіна язды. Дакладная адлегласць выбіваецца на білеце. Расклад руху надрукаваны на аркушы А4 і налеплены на прыпынку. Ад часу надпісы бываюць не зусім чытабельныя. Каб аўтобус затрымаўся, трэба, каб кіроўца выразна бачыў, што вы хочаце ехаць, а не прыселі адпачыць. На прыстанках мужчыны чакаюць пакуль у аўтобус не зайдуць усе жанчыны. Білеты набываюцца ў кіроўцы. У вёсцы дзве крамы, якія пачынаюць працу ў 6 гадзін раніцы. І з гэтага часу на лавачках каля крамаў можна назіраць аматараў піва, якое з'яўляецца тут найбольш папулярным напоем. У крамах можна набыць усё ад запалак да газавых балонаў, якія прадаюцца свабодна. Пошта працуе 5 дзён на тыдзень ад 8 да 12 — 4 гадзіны ў дзень. Бібліятэка працуе 3 дні на тыдзень ад 16 да 20 гадзіны. Пенсіянеры і не толькі маюць магчымасць здаваць розныя зборы траў, грыбоў, ягад на нарыхтоўку. Кілаграм лісічак, якія ў Трасцянцы называюць плiскамі, можна здаць за 5 злотых (4 400 рублёў). Маладзейшыя ездзяць на працу ў Нарву, дзе ёсць цэх па зборцы трактароў „Беларусь" і вырабу іншых рэчаў для сельскай гаспадаркі (заробак 500-600 долараў), працуюць на сезонных работах або адкрываюць сваю справу. Мне прыйшлося некалькі разоў звяртацца па пытаннях рамонту трактара і касілкі да такога прадпрымальніка, спадара Міхала — працавітага ўмелага майстра, добрага чалавека і сем'яніна, закаханага ў сваіх унукаў. Ён ужо больш за 15 год займаецца рамонтам рознай сельскагаспадарчай тэхнікі. Калі мы ўсталёўвалі на „мой" ЮМЗік (трактар) падвойныя колы, з'явіўся нейкі пан з тэчкаю і стаў з разумным выглядам нешта разглядаць у майстэрні. Я запытаў у Міхала, ці гэта не правяраючы. Міхал адказаў, што гэта электрык, якога заклікалі, бо не працуе халадзільнік. А з'ява правяраючага непажаданая, бо могуць узнікнуць клопаты. „І як часта наведваюцца правяраючыя?" — не адставаў я. „За час маёй працы яшчэ не было", — адказаў спадар Міхал. Значыць, не было ні разу на працягу 15 гадоў! Каб стаць прадпрымальнікам, трэба стаць на ўлік у гміне і плаціць фіксаваны налог 250 злотых дзяржаве і 50 злотых у гміну за зямлю. Мая знаёмая бабка Ганна пачынала працоўную дзейнасць да вайны на чыгунцы. Пасля вайны выйшла замуж і працавала на сваёй гаспадарцы. Цяпер на пенсіі, якая складае 300 долараў. Бабка Ганна пры кожнай сустрэчы са мной распавядала адну і тую ж гісторыю: як яна ўцякла з дому, бо яе хацелі выдаць замуж за нялюбага, як яна вывучылася і стала працаваць на цягніку, які ездзіў з Беластока ў Вільню, як яе ў дарозе застала вайна і ўся абслуга цягніка, 17 чалавек, пеша вярталася з Вільні ў Беласток, і яна не дазволіла прагнаць прыбіўшагася да іх яўрэйскага хлопца, тым самым выратаваўшы яго ад смерці. Бабка Ганна ўжо пахавала мужа і двух сыноў. Але яшчэ двое жывыя і жывуць добра. Але яна ўсё роўна садзіць пару градак гародніны і пры кожным прыездзе дзяцей стараецца нешта даць ім з сабой з яе агародзіка. Мяне бабка Ганна шкадавала, што я жыву адзін і няма каму для мяне гатаваць ежу. І бывала прыносіла мне на вячэру місачку цёплых дзяруноў ці супу з плiскамі, некалькі цыбулін і памідораў. І ніколі не дазваляла адвезці яе дадому на машыне, хоць ісці трэба было з добры кіламетр. Другі мой знаёмы з Трасцянкі, малады хлапец Славік, хворы на падучку, таму нідзе настала не працуе, а зарабляе выпадковымі працамі па найме. Ён падзяліўся са мной яшчэ адной сваёй праблемай. Яго затрымала паліцыя, калі ён ехаў на ровары на падпітку. За гэта яго вызывалі на адміністрацыйную камісію ў Гайнаўку. А калі такое затрыманне адбываецца неаднаразова, то за гэта могуць нават пасадзіць, казаў Славік. Ён мне расказаў і як плацяць за часовую работу — 6 зл. (5 000 рублёў) за гадзіну працы. На падборцы бульбы за дзень 50 зл. (44 000 рубл.), тры разы кормяць, на ранку і ў абед — па чарцы, а вечарам — уволю. Яшчэ можна добра зарабіць на адлове гусей на ферме, бо гэтую працу выконваюць уначы.

Цікавасць завяла мяне і на трасцянскія могілкі. Новыя пахаванні ўражваюць вельмі шыкоўнымі надмагіллямі. Як мне казалі ў вёсцы, такі помнік каштуе 10 000 долараў. Уся прастора паміж магіламі засеяна газоннай травой і акуратна выбрыта газонакасілкай. У чатырох кутах вялікія скрыні для смецця. Скромная агароджа з сеткі. Надпісы на помніках на польскай або на... рускай мовах.

Пра цэны ў крамах многа сказаць не магу і лічу, што ў гэтым няма патрэбы, бо яны з большага ўсім вядомыя. Тое, што трэба штодзённа, даволі таннае. З-за гэтага я меў прыгоду з каўбасамі. Каб жонка не злавала, што прыязджаю з пустымі рукамі, купіў я ў Беластоку аж 6 кіль розных каўбас ды мяса аж на 80 злотых (70 000 рубл.). Калі я ўтасаваўся ў цягнік Кузніца — Гродна, набіты як бочка селядцамі гродзенцамі з розным таварам, то даведаўся, што, згодна з указам прэзідэнта, нельга правозіць нават бутэрброда з мясам. Бывалыя падарожнікі раілі мне ўсё выкінуць, бо буду мець вялікія клопаты на мытні і ўсё роўна ўсё канфіскуюць. Але на такое злачынства я пайсці не мог. Прасунуўшыся разам з натоўпам праз паўметровую шчыліну дзвярэй на Гродзенскай мытні і зрабіўшы морду цэглай, я чакаў канфіскацыі. Лёс паслаў мяне да мытніка, які толькі што на ўвесь свет спавядаў нейкую жанчыну за большую чым дазволена колькасць ні то шкарпэтак, ні то калготак. Гледзячы яму проста ў вочы, кажу, што на продаж нічога не вязу, а вязу толькі асабістыя рэчы, што было святой праўдай. Недаверліва глянуўшы на мяне, потым на торбу з распіханымі каўбасамі прыкрытымі аддзеннем, потым на тэчку з паперамі і кніжкамі, ён буркнуў: „Ідзі". Я і пайшоў.

Праца для мяне была даволі цяжкай па некалькіх прычынах. Па-першае, такі род працы быў для мяне ўпершыню, хоць у маладосці я закончыў Жыровіцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі і Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі той жа гаспадаркі. Па-другое, каб касіць балота, трэба спачатку дасканала разведаць участак пеша, праставіць тычкі, але і гэта яшчэ не гарантыя не ўваліцца ў багну. Выкасіў участак, вылазь з трактара і тапчы балота, шукай наступны... Па-трэцяе, трэба было самому варыць сабе ежу, нягледзячы на стому, чаго страшэнна не люблю. Штодзень трэба было ўстаць у 5^{30} раніцы і, праехаўшы па шашы з 5 км, з 3 км па лесе і з 2 км па лузе, перайсці па грудзі ўброд раку Нарву з парачкай 20-літровых каністраў з саляркай, давалачы іх да трактара і, заправіўшы ЮМЗік, пачаць касіць, калі ўжо быў вытычкаваны ўчастак. Або пачаць з падарожжа па балоце ў пошуках участка, прыдатнага да касьбы. У абед і вечарам усё трэба было паўтарыць. Заўсёды прысутнічаў страх заваліцца ў багну, бо найчасцей самастойна з яго выбрацца было немагчыма. Трэба было ў вёсцы шукаць трактар і разлічвацца за дапамогу. Ад рэгулярных вандровак па балоце ніжняя частка цела часценька была мокрай. Сушыўся ля каміна і з тыльнай стараны халадзільніка. Але ўсе цяжкасці скрашваліся цудоўнымі краявідамі, напоўненымі густым незвычайным паветрам і... абяцаным заробкам. На бродзе я ўжо распазнаваў жаб па колеравых адценнях. І калі якаясь жыхарка дома ля брода не паказвалася пару дзён, можна было быць упэўненым, што вінаватыя буслы. Яны паважным эскортам суправаджалі трактар на адлегласці 15-20 метраў, выкарыстоўваючы пракосы для свайго палявання. У верасні яны адляцелі і стала іх не хапаць. Воддаль, не бліжэй за 500 метраў, у здзіўленні, падняўшы прыгожыя галовы, затрымліваліся казулі. Пастаяўшы некалькі хвілін у назіранні за рыкаючым страшыдлам-ЮМЗікам, яны грацыёзнымі скачкамі аддаляліся і знікалі ў балотным трыснягу. Калі ж настала бабіна лета, і ўсё навокал заблішчала іскрыстымі перламі ў праменнях узыходзячага сонца, я не вытрымаў, каб не напісаць аб гэтым не проста прозай. Вось што з гэтага атрымалася:

Восень

Зніклі з поля журавы/ Адляцелі ў вырай/ Ад дажджоў і навальніц/ Рэчка стала шырай/ Зелень ранішняй травы/ Пасярэбрыў іней/ Вада чыстая крыніц/ Стала цёмнасіняй/ Сосны выстраіліся ў шлюб/ У сукнях з павуціння/ Лета бабіна прыйшло/ Не ўсядзець у хаціне/ Нават смак жаночых губ/ Стаў з другім адценнем/ Штосьці недзе адышло/ Засталось імгненне...

Я сам сабе задаваў пытанне: навошта я гэта пішу, ці будзе гэта каму цікава, ці ёсць у гэтым хоць якая карысць? Не ведаю. Але я быў бы вельмі рады мець падобныя запісы аб маёй вёсцы, якой яна была 500, 300 ці 30 год таму. Дык можа, калі не цяпер, то ў будучыні гэтыя запісы камусьці будуць цікавымі. А можа варта нам на Беларусі больш ведаць аб нашых крэсах і ў нечым браць прыклад?

Зарабіў я няблага. За няпоўныя два месяцы 1 300 долараў і яшчэ дзве зэканомленыя пенсіі. Можна пэўны час заняцца калекцыяніраваннем. Але не толькі ў грашах задавальненне. Я спаткаў Беларусь і беларусаў там, дзе не чакаў, за мяжой, і адкрыў для сябе Беларускія Крэсы. Запрашаю чытача адкрыць іх разам са мной. Калі ва ўмовах другой культуры, другой дзяржавы яны не толькі выжылі, але захавалі сваю гістарычную памяць, сваю мову, сваю культуру, то ёсць вялікая надзея на Адраджэнне і тут, у Незалежнай Беларусі.

Жыве Беларусь!

Трасцянка — Лунна